№ 29 (674) 4 жніўня 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

**Хто валодае беларускімі банкамі?**

Старонка 4




**«Калі Сідорскі, мы яму дапаможам»**

Старонка 9



**Гісторыя Беларусі. Полацк як Троя**

Старонка 10



**У НУМАРЫ**

**Хросны бацька як дзяржаўны орган**

«Нашу Ніву» пакаралі адразу двума папярэджаннямі і падатковай праверкай. **Старонка 2.**

**Заробкі малыя, бо клопат пра народ вялікі**

Некалі было: я народ за цывілізаваным светам не павяду! Сёння: я вам хоць заўтра зраблю тут Еўропу, але ж вы самі не гатовыя! Піша Аляксандр Класкоўскі. **Старонка 7.**

**NASA перадае: на Сонцы магутны выкід плазмы**

Наступствы яго Зямля адчуе 4 жніўня. **Старонка 8.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

ТУРЫСТЫЧНАЕ АГЕНЦТВА «ГІСТОРЫЯ-ТУР»

- Тур на фестываль «Гальшанскі замак», 21.08.2010 (папярэдні продаж квіткоў і арганізаваная дастаўка транспартам)
- Аўтобусныя экскурсіі па Беларусі
- Адпачынак у Еўропе і на моры
- Карпаратыўны адпачынак у шляхецкім фальварку Карчэўскіх, што ў Бянюнах

(029) 677 00 46 www.h-t.by

УНП 590883964. Лц. № 02310/0531453 г. МОіТ выд. 21.09.2009 да 21.09.2014

# Хутка будзе як у Афрыцы

У пятніцу–суботу чакаецца да 38—40 градусаў!



**Паўтары тысячы былых дэсантнікаў адзначалі Дзень дэсантніка ў цэнтры Мінска. Больш за ўсё іх сабралася на Востраве слёз, у парках Янкі Купалы, Горкага і Чэлюскінцаў. Абышлося без сур'ёзных інцыдэнтаў, але прылюдных п'янак і высвятлення адносінаў з людзьмі на вуліцах хапала.**

УЛАДЗЬ ГРЫДЗІН

# Ці сустрэнецца Мядзведзеў з беларускімі апазіцыянерамі?

Чуткі пра гэта ходзяць, але застаюцца чуткамі.

Расія хацела б, каб іншыя краіны таксама прызналі Абхазію і Паўднёвую Асецію, але гэта не самамэта, заявіў у аўторак прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў. Гаворачы пра пазіцыю Мінска ў гэтым пытанні, кіраўнік расійскай дзяржавы паведаміў, што Аляксандр Лукашэнка раней казаў пра намер прызнаць Абхазію і Паўднёвую Асецію. Паводле Мядзведзева, такое абяцанне беларускі лідэр даў у прысутнасці кіраўнікоў шэрагу краін СНД.

«Ён сказаў: «Я ўрачыста абяцаю, што я ўсё зраблю за самы кароткі час», — Мядзведзеў фактычна абвінаваціў Лукашэнку ў невыкананні сваіх абяцанняў.

Падобна, што беларускае і расійскае кіраўніцтва не хочуць шукаць супольную мову. Усё часцей гавораць пра тое, што на выбарах Крэмль падтрымае не Лукашэнку, а іншага палітыка. Знакам гэтага магла б стаць сустрэча Мядзведзева з беларускімі апазіцыянерамі. Нехта запускае чуткі, што яна можа адбыцца ў верасні. Зрэшты, сам Мядзведзеў падчас спаткання ў Барвісе з беларускімі журналістамі не выключаў такой магчымасці.

Кандыдат у прэзідэнты ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі Яраслаў Раманчук кажа, што імавернасць «вельмі-вельмі малая». «30 жніўня ў Маскве мы праводзім беларуска-расійскую канферэнцыю. З Беларусі на яе прыедзе чалавек дваццаць удзельнікаў. Ад Расіі арганізоўваюць нашы даўнія партнёры Уладзімір Рыжкоў і Леанід Гозман. Мы не ведаем, ці прыйдзе туды хтосьці ўвогуле з крамлёўскай адміністрацыі, што тады казаць пра Мядзведзева», — лічыць Я.Раманчук.

Маскоўскі палітолаг Андрэй Суздальцаў называе магчымасць сустрэчы «абсалютным глупствам». «Беларускія апазіцыянеры ўцягнутыя ў працэс выбараў, тым самым яны легітымізуюць дзейную ўладу. У рамках аўтарытарнага рэжыму немагчымая перамога нікога з кандыдатаў. Вось прыме Мядзведзеў, напрыклад, генерала Фралова. А потым гэтага кандыдата заваляць на выбарах. Ён не проста прайграе, а зробіць чацвёрты тэрмін Лукашэнкі законным. Таму Масква ніяк не будзе браць удзелу ў гэтых выбарах. Не трэба шукаць у шэрагах апазіцыі людзей, якіх падтрымае Крэмль, — такіх не будзе», — кажа А.Суздальцаў.

Аналітык гаворыць, што падтрымкі Лукашэнку ад Расіі таксама не будзе. «Вось у Мінску кажуць, што Лукашэнку валяць. Гэта не так. Расія проста спрабуе вырашыць свае макраэканамічныя пытанні — пастаўкі паліва, транзіту. Беларусь і Расія выходзяць на ўзровень роўных незалежных дзяржаў. Дарэчы, тое самае ў свой час было і з Кыргызстанам. А ўмешвацца ва ўнутраныя справы навошта?» — не без іроніі кажа палітолаг.

Чым скончыўся «выхад на ўзровень» для рэжыму Бакіева, нагадваць без патрэбы.

Суздальцаў зазначае, што пакуль у Беларусі няма перспектываў для сыходу Лукашэнкі. «Калі траву людзі не пачнуць есці, ён застанецца ва ўладзе. Тым не менш, эканамічны цуд у многім развеецца. Беларусь будзе гэткай Паўночнай Малдовай. Ну а далейшы выбар залежыць ад саміх грамадзян», — сказаў А.Суздальцаў.

**Зміцер Панкавец**

# Хросны бацька як дзяржаўны орган

## «Наша Ніва» атрымала адразу два папярэджанні ад Міністэрства інфармацыі

На працягу аднаго тыдня газета «Наша Ніва» атрымала два папярэджанні ад Міністэрства інфармацыі. У загалоўках артыкулаў, у якіх былі знойдзеныя «парушэнні», фігуруе «Хросны бацька». Абодва папярэджанні непасрэдна тычацца нумару «НН», які чытачы па ўсёй краіне не знайшлі ў кіёсках «Белсаюздруку».

У папярэджанні, датаваным 22 ліпеня, Мініінфармацыі вінаваціць газету ў распаўсюдзе звестак, якія не адпавядаюць рэчаіснасці. Падставай для абвінавачання стаў загаловак «Хросны бацька сканфіскаваў» («НН» № 26). «Паводле артыкула 244 Грамадзянскага кодэкса РБ, канфіскацыяй з'яўляецца бязвыплатнае адабранне маёмасці ва ўласніка ў выглядзе санкцыі за здзейсненае злачынства ці іншае правапарушэнне», — адзначае Мініінфармацыі. Далей прадстаўнікі міністэрства спасылаюцца на інфармацыю РУП «Белсаюздрук» аб тым, што наклад «НН» № 25 ад 7 ліпеня 2010 «быў накіраваны для рэалізацыі ў гандлёвыя аб'екты прадпрыемства». Адпаведна, лічыць Мініінфармацыі, «канфіскацыя выдання не ажыццяўлялася».

Інфармацыя, змешчаная ў артыкуле «Хросны бацька сканфіскаваў», як адзначаецца ў лісце за подпісам міністра Алега Праляскоўскага, «можа нанесці шкоду ў тым ліку і дзяржаўным інтарэсам, бо скажае практыку ўзаемадзеяння дзяржавы з сродкамі масавай інфармацыі».

Другое папярэджанне, датаванае 26 ліпеня, тычыцца артыкула «БРСМ рэкламуе фільм «Хросны бацька», змешчанага ў «НН» № 25. «Згодна з інфармацыяй грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» актывістамі згаданага аб'яднання 6 ліпеня ў г. Мінску была зладжаная акцыя, зместам якой не з'яўлялася рэклама згаданага фільма», — адзначаецца ў лісце. Адпаведна, лічаць у Мініінфармацыі, «апублікаваная інфармацыя не адпавядае рэчаіснасці і ганьбіць рэпутацыю дадзенай юрыдычнай асобы».

Мінулым разам «Наша Ніва» атрымлівала папярэджанне ў лістападзе 2009. Тады газету звінавацілі ў публікацыі неправераных звестак пра эпідэмію грыпу.

Рэдакцыя скіравала ў Міністэрства інфармацыі ліст, у якім паведаміла, што не пагаджаецца з папярэджаннямі і просіць іх скасаваць. У іншым выпадку будзе звяртацца ў суд.




Кінулася ў вочы механічнасць папярэджанняў, якія атрымала «НН» ад Міністэрства інфармацыі. Без крэатыву працуе апарат. Загадалі пакараць — знайшлася віна: загаловак «БРСМ рэкламуе фільм «Хросны бацька» з дапамогай смецця» не адпавядае рэчаіснасці. І падрывае рэпутацыю БРСМ, бо... мэтай акцыі лукамольцаў ля Камароўкі не была рэклама.

Яшчэ адна правіна «НН» — ужыванне слова «канфіскацыя» для характарыстыкі лёсу зніклага нумару (№25 ад 7 ліпеня 2010). Бо, па-першае, «канфіскацыяй з'яўляецца бязвыплатнае адабранне маёмасці ва ўласніка ў выглядзе санкцыі», а па-другое, «Белсаюздрук» сцвярджае, што нумар «быў накіраваны для рэалізацыі ў гандлёвыя аб'екты».

Накіраваны ён, можа, і быў, але ў шапіках не з'явіўся. Гэта пацвердзяць тысячы чытачоў па ўсёй краіне. Галоўнаму рэдактару ў палове абласных «Саюздрукаў» сказалі, што «НН» № 25 ім не паступіла.

Ці засталося б мокрае месца ад «Советской Белоруссии», каб праверыць на прадмет адпаведнасці фармулёўкам кодэксаў метафары Ксенафонта Суперфасфатава? Узяць хоць бы «отравители эфира» (пра канал НТВ), ці «девочки, которые любят спать между двумя мальчиками» (пра ўдзельнікаў Плошчы-2006).

Яшчэ міністэрства адзначае, што артыкул «Хросны бацька сканфіскаваў» «можа зрабіць шкоду ў тым ліку і дзяржаўным інтарэсам, бо скажае практыку ўзаемадзеяння дзяржавы са СМІ». Што гэта значыць? Мініінфармацыі залічыла ў дзяржаўныя падначаленыя РУП «Белсаюздрук»? Але яго адасобленасць ад дзяржавы тое самае міністэрства ўпарта падкрэслівала, калі незалежныя газеты дабіваліся права вярнуцца ў кіёскі.

Ці, можа, у нас ужо ёсць дзяржаўны орган, што называецца «хросны бацька»? Вельмі характэрна, што інтарэсы пэўнай асобы чыноўнікі атаясамліваюць з дзяржаўнымі. Забываючыся на Канстытуцыю, паводле якой крыніца ўлады ў краіне — беларускі народ. Гэта значыць — падаткаплатнікі, якія на чыноўніцкія заробкі грошы даюць. Чытачы і аўтары незалежнай прэсы ў тым ліку.

Калі што і робіць шкоду рэальным дзяржаўным інтарэсам, дык гэта папярэджанні падобнага кшталту. Бо ствараюць Беларусі ў свеце імідж краіны, дзе парушаецца адно з базавых правоў асобы — права на свабоду слова. Бо ўскладняюць дыялог улады з незалежным грамадствам. Бо, урэшце, адрываюць журналістаў ад іх працы на карысць чытачоў і змушаюць займацца бюракратычнай руцінай. Дый час і энергія працаўнікоў Мініінфа марнуюцца на пустое.

Відавочна, першаснае значэнне мае не сутнасць дадзеных «НН» папярэджанняў, а іх колькасць. Разам з атрыманым 16 лістапада 2009 за публікацыю пра «свіны грып» газета мае тры папярэджанні. Столькі ж у «Народнай волі». Наяўнасць трох «званочкаў» ад Мініінфа дае падставы пачаць працэс ліквідацыі газеты. Але, як адзначае юрыст Андрэй Бастунец, у беларускіх умовах на гэта трэба палітычная воля. У год выбараў улада спрабуе ўзяць прэсу на кароткую шворку.

А мы будзем рабіць сваю справу.

**Рэд.**

### І ў дадатак — пазапланавая падатковая праверка

Раніцай 2 жніўня інспектарка Міністэрства па падатках і зборах праз тэлефон паведаміла, што рыхтуецца пазапланавая праверка прадпрыемства выдаўца «Нашай Нівы» — прыватнага прадпрыемства «Суродзічы».

На пытанне, з чым гэта звязана, — апошні раз «Суродзічы» правяралі зусім нядаўна, у верасні 2008, — яна сказала, што праверка ладзіцца на загад міністра.

Нагадаем, на мінулым тыдні газета атрымала адразу два папярэджанні ад Міністэрства інфармацыі за артыкулы, звязаныя з фільмам НТВ «Хросны бацька». А «НН» № 25 з інфармацыяй пра фільм, паводле звестак ад чытачоў, не з'явілася ў кіёсках «Белсаюздруку».

Згодна з указам № 510 «Аб удасканаленні кантрольнай (наглядной) дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь» суб'екты гаспадарання, аднесеныя да нізкай групы рызыкі, як «Суродзічы», павінны правярацца не часцей за адзін раз на 5 гадоў.

**Просім усіх чытачоў, якія не знайшлі «НН» №25 у кіёсках саюздрукаў, і гатовых сведчыць пра гэта ў судзе «НН» супраць Міністэрства інфармацыі, звязацца з Рэдакцыяй. Таксама звяртаемся да кіяскёраў, якія не атрымалі той нумар газеты для продажу.**

**Тэлефануйце:** (17) 284–73–29; (29) 613–32–32; (29) 707–73–29.
**Пішыце:** nn@nn.by. **Паштовы адрас:** а/с 537, Мінск, 220050

## Сцісла

• **За студзень—чэрвень Беларусь купіла за мяжой тавараў на $3,5 млрд больш, чым прадала за мяжу.** Жывем у крэдыт. За такі ж леташні перыяд гэты паказчык быў на ўзроўні $3,9 млрд. У цэлым крызіс мінае, але дэфіцыт застаецца. Аб'ём замежнага гандлю таварамі павялічыўся на 17,8% у параўнанні са студзенем—чэрвенем 2009 і склаў $26,1 млрд даляраў. У тым ліку экспарт павялічыўся на 23,7% да 11,3 млрд даляраў, імпарт — на 13,7% да 14,8 млрд.

• **Выдаюць 25-томнік Уладзіміра Караткевіча.** Выхад Поўнага збору твораў пісьменніка разлічаны на 2011—2020 гады. Выдае яго «Мастацкая літаратура». Гэта будзе першае поўнае навуковае выданне з каментарамі. Папярэдні збор пісьменніка (1987—1991) налічваў толькі восем тамоў. На наступны год запланаваны выхад двух тамоў, якія ўключаць паэзію 1950-х — 1984 гадоў. Таксама з'явіцца дыск з выкананнем вершаў і песняў самім Караткевічам. Усіх дыскаў будзе тры. Іх мяркуюць прыкладаць да канкрэтных тамоў. У другі CD увойдуць выступленні пісьменніка. Асобным дыскам выйдзе электронная бібліятэка твораў Караткевіча. Такой бібліятэкай ужо цяпер можна карыстацца на сайце uladzimir-karatkevich.com.

• **Доля «Харвеста» ў мастацкім кнігавыданні Беларусі дасягнула 96%.** У 2008 выдавецтва «Харвест», якое ўваходзіць у склад найбуйнейшага расійскага холдынга «АСТ», выпускала 77% найменняў і 90% накладу ўсёй выдадзенай мастацкай літаратуры. У мінулым годзе гэтыя лічбы склалі 65% і 94%. У першым паўгоддзі 2010 за ім «замацаваліся» 57% найменняў і 96% накладаў. Другое выдавецтва пасля «Харвеста», якое выпускае літаратурна-мастацкія выданні, — «Мастацкая літаратура» — выдала 66 кніг агульным накладам 300 тысяч асобнікаў у 2009. У першым паўгоддзі гэтага года — усяго 10 мастацкіх найменняў агульным накладам толькі 16,8 тысячы.

• **У дзіцячым «Еўрабачанні» возьмуць удзел 14 краін.** 20 лістапада ў Мінску збяруцца юныя таленты ва ўзросце ад 10 да 15 гадоў з Арменіі, Беларусі, Бельгіі, Грузіі, Латвіі, Літвы, Македоніі, Мальты, Малдовы, Нідэрландаў, Расіі, Сербіі, Швецыі і Украіны. Латвія і Малдова стануць удзельнікамі дзіцячага «Еўрабачання» ўпершыню.

**СМ**

### Самае чытанае на nn.by за 28 ліпеня—3 жніўня

- Клуб багацеяў Дзмітрыя Лукашэнкі
- Чачэнскі позірк
- Мінск — адно з самых прывабных месцаў Еўропы?
- Навумава «сватаюць» у супернікі Лукашэнкі
- «Наша Ніва» атрымала адразу два папярэджанні ад Міністэрства інфармацыі
- Чаму дзяцей у школах вучаць былыя двоечнікі і троечнікі
- Адпачынак у Чарнагорыі: досыць аднаго разу
- Білборды з Мілінкевічам ва Украіне
- За што п'яны ўчастковы стрэліў у Ніну ва ўпор – жахлівыя падрабязнасці
- Поле цудаў

### nn@nn.by

Рэальнасць такая, што ў Беларусі існуюць дзве адукацыі: афіцыйная бясплатная ў школе — і ценевая платная з рэпетытарамі.

А даўно трэба перастаць займацца самападманам і дазволіць стварыць проста камерцыйныя школы з частковым дзяржаўным фінансаваннем (з розніцу нармальных выдаткаў на вучня ў звычайнай дзяржаўнай школе) і часткова платныя для бацькоў.

Тады тое, што цяпер «рэпетытарства», зможа проста стаць навучальным працэсам. І ў камерцыйнай арганізацыі бюракратыя будзе мінімалізавана, прыватнікі на ёй зэканомяць.

**Адлеглы**

Разумныя вучні засталіся. Калі не верыце, зайдзіце ў Ліцэй БДУ. Калі б усе школы былі як той Ліцэй, шмат пытанняў вырашана было б: і з ведамі школьнікаў, і з татальным абыдленнем.

**Semens**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам, якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Галіне Ч. з Рэчыцкага раёна.
І.Б. з Оршы.
Віталю Г. з Чачэрскага раёна.
Мікалаю І. з Лунінецкага раёна.
Аляксандру Г. з Кіраўскага раёна.
Уладзіміру Т. з Жлобінскага раёна.
Уладзіміру Я., Галіне Г. з Барысаўскага раёна.
І.В. са Стаўбцоўскага раёна.
Сяргею К., А.Н. з Салігорскага раёна.

# Чаму не могуць паяднацца Мілінкевіч і Рымашэўскі?

Ідэя вылучэння адзінага кандыдата ад правай кааліцыі «Беларускі незалежніцкі блок» тармозіцца. Пакуль ёсць два імаверныя кандыдаты — лідэр Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч і сустаршыня Беларускай хрысціянскай дэмакратыі Віталь Рымашэўскі.

На суботняй абласной канферэнцыі дэмакратычных сіл у Магілёве Мілінкевіч заявіў, што «бярэ на сябе ролю лідэра праbеларускіх праеўрапейскіх сіл». Разам з тым, Віталь Рымашэўскі зазначыў, што ўсе прапановы БХД па вылучэнні адзінага блакаваліся.

Мы звярнуліся па каментар да іншага сустаршыні «хадэкаў» Паўла Севярынца.

**«Наша Ніва»: Дасягнуць нейкага пагаднення з Мілінкевічам магчыма?**

**Павал Севярынец:** Магчыма. Калі Мілінкевіч будзе працаваць на перамогу і возьме для сваёй кампаніі хрысціянскую платформу. Два месяцы таму мы зрабілі свае прапановы, на якіх умовах гатовыя працаваць на Мілінкевіча. Адказу няма да сёння. Пры гэтым мы казалі, што гатовыя ўзяць усю кампанію на сябе.

**«НН»: І што гэта за ўмовы?**

**ПС:** Кіраўнік перадвыбарчага штаба — Віталь Рымашэўскі, кіраўнік ценявога ўрада — Аляксей Януковіч. Трыма з сямі рэгіянальных структураў павінны былі кіраваць прадстаўнікі БХД. За мной замацоўвалася праца з рэгіёнамі. Разам з тым, мы казалі, што такім людзям, як Уладзь Лабковіч, Алесь Лагвінец, Віктар Карняенка, натуральна, будзе месца і праца ў штабе. Але гэтых людзей не цікавяць паплечнікі. Я страшэнна расчараваны, бо няма згоды. Наша мэта — перамога. Калі ў Мілінкевіча мэта — удзел, то нам яўна не па дарозе.

**«НН»: І што цяпер, БХД дакладна ідзе на выбары асобнай калонай?**

**ПС:** Мы ідзем на кампанію, ідзем на Плошчу, ідзем да перамогі. Прычым ідзем з хрысціянскай кампаніяй, з маральнай. Гэта тое, што мы найперш можам прадставіць выбарцам як альтэрнатыву. Аргументы па незалежнасці ці эканоміцы, магчыма, не больш пераканаўчыя, чым у дзейнай улады. Знаходжанне кампрамісу з Мілінкевічам усё яшчэ імавернае, але шанцаў на яго застаецца ўсё менш.

У Руху «За Свабоду» лічаць такую прапанову БХД неабгрунтаванай. Намеснік Мілінкевіча Віктар Карняенка кажа: «Многія людзі ў БХД нічым, акрамя размоваў, у жыцці не вызначыліся. Таму і прапановы прыняць не можам, бо не ведаем, што гэта за людзі і якія ў іх дасягненні. Тым больш, прапанавана нам гэта было ў ультыматыўнай форме, а гэта непавага да суразмоўцы».

Звонку выглядае, што прапанова хрысціянскіх дэмакратаў даволі лагічная і абгрунтаваная. БХД за апошні год зрабіла якасны крок, каб называцца адной з наймацнейшых палітычных сілаў у краіне. Здаецца, унутры Руху не могуць яе прыняць, бо баяцца за дысцыпліну. Што той жа няўрымслівы Рымашэўскі не будзе падпарадкоўвацца агульным рашэнням, а гнуць сваю лінію, хай і адрозную ад Мілінкевіча.

Тым не менш, у адзінстве Мілінкевіча і Рымашэўскага зацікаўленыя нацыянальныя сілы. Толькі разам можна разлічваць на правядзенне годнай кампаніі. У адваротным выпадку можа здарыцца, што ніводзін з беларускамоўных кандыдатаў не набярэ неабходных 100 тысяч подпісаў. А гэта ўжо будзе вялікай паразай для незалежнага грамадства. Хочаш не хочаш, а кампрамісы трэба шукаць.

**ЗП**

**Беларускі незалежніцкі блок**

Утвораны ў кастрычніку 2009 года Рухам «За Свабоду», БХД, Партыяй БНФ, «Маладым фронтам», «Маладой Беларуссю», «Правым альянсам», Рухам «Разам» і «Маладымі дэмакратамі». «Блок грунтуецца на патрыятычных, хрысціянскіх і еўрапейскіх каштоўнасцях», — заявіў пасля падпісання дамовы Павел Севярынец.

## Білборды з Мілінкевічам ва Украіне

На мяжы Украіны з Беларуссю з'явіліся білборды з выявай Аляксандра Мілінкевіча. На рэкламным шчыце па-беларуску напісана: «Разам у Еўропу».




Напэўна, такім чынам прыхільнікі Мілінкевіча хочуць заручыцца падтрымкай тых суайчыннікаў, што адпачываюць летам на Украіне.

«Выраб і размяшчэнне — не нашых рук справа. Пра білборды ведаем і мы не супраць, каб яны там былі», — кажа намеснік старшыні Руху «За Свабоду» Юрась Губарэвіч.

Перад выбарамі-2006 білборды з выявай Мілінкевіча былі на Смаленшчыне, але іх хутка знялі.

**ЗП**

## Дзяніс Дзянісаў: Наўрад ці прыеду на Плошчу

Ён быў адной з легендаў мінскай Плошчы ў сакавіку 2006. Кажуць, што менавіта кучаравы віцяблянін Дзяніс Дзянісаў паставіў на Кастрычніцкай першы намёт. Потым хлопца асудзілі на 15 сутак. Нейкі час прозвішча Дзянісава было яшчэ на слыху.

Праз год ён правёў некалькі месяцаў у СІЗА па абвінавачанні ў арганізацыі групавых дзеянняў, якія парушаюць грамадскі парадак. У той самы 2006-ы актывісты БУНТа на дзень нараджэння Васіля Быкава вывесілі ў Віцебску дзясяткі бел-чырвона-белых сцягоў. Гэта і было «парушэннем парадку».

Па вызваленні з ізалятара Дзянісаў знік. Нам удалося адшукаць яго ў родным Віцебску. Хлопец быў на пахаванні былой кіраўніцы абласнога АГП Алены Залескай. Цяпер Дзянісаў каротка падстрыжаны, а валасы ўзяла сівізна. Дзянісаву ўжо за трыццаць.



**Дзяніс Дзянісаў і Сяргей Каваленка (на заднім плане) — героі розных генерацый.**

**«Наша Ніва»: Куды прапалі?**

**Дзяніс Дзянісаў:** Ды нікуды я не прападаў. Вучуся па Праграме Каліноўскага ў польскай Лодзі ў магістратуры па спецыяльнасці «Паліталогія. Стратэгія бяспекі». Таксама займаюся перакладамі на расійскую, польскую, англійскую. Замовы ў асноўным робяць гандлёвыя фірмы. Займацца нейкай дзейнасцю ў Польшчы няма сэнсу. Дый рэдка хто звяртаецца. Часам бывае, што арганізоўваем прагляды фільмаў.

**«НН»: А калі сёлета будзе новая Плошча, прыедзеце?**

**ДД:** Наўрад ці. Мне здаецца, што цяпер сітуацыя троху іншая. Шмат людзей на Плошчы не будзе. Трэба, каб людзей нехта павёў за сабой. Той, за каго яны галасавалі. А хто павядзе? Саннікаў, Раманчук? Не, яны не павядуць.

**«НН»: У 2006 годзе кандыдаты былі мацнейшымі?**

**ДД:** На мінулых выбарах быў адзіны кандыдат. А гэта неяк аб'ядноўвала. Цяпер чым больш будзе кандыдатаў, тым больш гэта будзе легітымізаваць сённяшнюю ўладу. Хаця не скажу, што кандыдаты слабыя. У Някляева добрая кампанія, якая знаходзіць водгукі ў людзей. У Раманчука добры аналітычны розум, ясная стратэгія. Але ці здольны ён яе данесці? З Мілінкевічам выбарцы ўжо знаёмыя, у яго ёсць электаральная база.

**«НН»: Дык трэба зноў адзіны?**

**ДД:** Трэба адзінства ўнутры ўсіх апазіцыйных сілаў. Пэўная ўнутраная кансалідацыя. Мінімальнае супольнае бачанне сваіх планаў і стратэгіі. Без гэтага нам не дасягнуць перамогі. Цяпер усе гадаюць, ці падтрымае Расія іншага кандыдата. Здаецца, у расійскім кіраўніцтве зразумелі, што ім патрэбная іншая кіроўная эліта ў Беларусі. Але для гэтага трэба час. Думаю, што на гэтых выбарах такая тактыка нічога не дасць. Аднак калі яна працягнецца, у чым я моцна сумняюся, то вынік можа быць.

**«НН»: Дык а жадання вярнуцца ў палітыку няма?**

**ДД:** Паглядзім. Пакуль на мне вісіць магістратура. Магчымасці свайго вяртання ў Беларусь, вядома, не адкідваю.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

## Зміцер Хведарук: Без тугі і без крыўдаў

29 ліпеня дэмабілізаваўся з войска Зміцер Хведарук. Моладзевы лідэр паўтара года адслужыў у Жодзіне ў чыгуначных войсках.

Зміцер Хведарук, Іван Шыла і Франак Вячорка былі прызваны ў беларускую армію пры канцы студзеня 2009. Тады гэты прызыў быў расцэнены як палітычны.

Хведарук — адзіны з гэтай тройкі, хто адслужыў цалкам, а не быў камісаваны цягам службы.

**«Наша Ніва»: З якім пачуццём выходзіш з войска?**

**Зміцер Хведарук:** Са спакойным. Натуральна, радасць нейкая прысутнічае. Аднак выходжу без усялякай тугі па войску і без крыўдаў на яго.

**«НН»: Гэтыя васямнаццаць месяцаў ты хутчэй аднясеш сабе ў плюсы ці мінусы?**

**ЗХ:** Былі нават адмоўныя моманты, якія



**Зміцер Хведарук з яфрэйтарскімі лычкамі.**

дазволілі стаць больш выхаваным, лепш разумець чалавека, чаму ён робіць так. Разам з тым, заставалася пачуццё марнасці салдацкай працы. Разумееш, калі раніцай ты коціш бочку на склад №1, а пасля абеду — на склад №2, з якога першапачаткова яна была ўзятая, то гэта напружвае.

**«НН»: А што было станоўчага?**

**ЗХ:** Было дастаткова часу, каб чытаць. Лічу, што за гэты час у мяне адбыўся духоўны рост. Навучыўся цаніць свой час. Прыйшло разуменне, наколькі важна быць з Богам.

**«НН»: Што будзеш рабіць цяпер?**

**ЗХ:** Хачу працягнуць навучанне. Прычым у Беларусі. Пазней трэба будзе знайсці нейкую падпрацоўку. Яшчэ хочацца пагуляць у футбол у якой-небудзь аматарскай камандзе.

**ЗП**

### Сцісла

• **«Хросны Бацька — 3» выйдзе на экраны ў сярэдзіне жніўня.** Тэлекампанія НТВ прыступіла да актыўных здымак трэцяй серыі скандальнага фільма «Хросны Бацька». Працяг выйдзе ў эфір напярэдадні 16 жніўня, калі ў Мінску традыцыйна ўспамінаюць зніклых палітыкаў і грамадскіх дзеячаў. Над фільмам працуе тая ж аўтарская група, якая рабіла першую і другую серыі.

• **Статус Бакіева — таямніца.** Начальнік Дэпартамента грамадзянства і міграцыі Аляксей Бягун адмовіўся пацвердзіць альбо абвергнуць факт звароту былога прэзідэнта Кыргызстана Курманбека Бакіева па прытулак у Беларусі.

• **Анатоль Лябедзька: «Ніводзін кандыдат катэгарычна не пагадзіўся б быць стаўленікам Расіі».** Такую заяву лідэр АГП зрабіў у інтэрв'ю расійскай газеце «Труд».

**ЗП**

# Хто валодае беларускімі банкамі?

Асноўныя замежныя гульцы ў банкаўскім сектары Беларусі — гэта Расія, Швейцарыя і Кіпр.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Прыватызацыя буйных дзяржаўных банкаў, такіх як «Беларусбанк», «Белінвестбанк» і «Белаграпрамбанк», — патэнцыяльнае ратаванне для ўлады, зберажонае на чорны дзень. Каб атрымаць пару мільярдаў даляраў, дастаткова прадаць амаль палову акцый, але пакінуць сабе кантрольны пакет.

Тое, што дзяржава ўпэўнена кантралюе сітуацыю ў банкаўскім сектары, пацвярджае наўмольная статыстыка. Замежны капітал прысутнічае ў статутных фондах ажно 26-ці з 31-го зарэгістраванага ў краіне банка. Але пры гэтым толькі 27% банкаўскіх грошай належаць замежнікам. Астатнія 73% — доля дзяржавы ці набліжаных да ўлады бізнэсоўцаў.

### Беларускія банкі

Як ужо было адзначана вышэй, «Беларусбанк», «Белаграпрамбанк» і «Белінвестбанк» захоўваюць дзяржаўную «прапіску». Цікава, што ўсе яны — прадстаўнікі ТОП-3 банкаў па памерах актываў. Іх сумеснае багацце перавышае $20 мільярдаў. Усе астатнія банкі, склаўшыся, маглі б наскрэбці толькі $8 мільярдаў.

Першым у чарзе на продаж стаіць «Белінвестбанк». Яго хочуць прадаць еўрапейцам за $530 мільёнаў. Здзелку меркавалі ажыццявіць да канца першага паўгоддзя, але воз стаіць на ранейшым месцы да гэтага часу... Да банка праяўляў цікавасць адзін з буйных нямецкіх банкаў, але, паводле яго стратэгіі, ён быў гатовы набываць адразу не пакет акцый у ім, а банк цалкам. Спачатку Беларусь на тое не ішла. Цяпер справа можа зрушыцца: дзяржава гатова расстацца з кантрольным пакетам акцый.

Астатнія два банкаўскія гіганты калі і будуць распрадавацца, то толькі па частках. Дзяржава гатовая аддаць максімум 25% акцый кожнага.

Не мае замежнага капіталу і «Парытэтбанк». Дарэчы, стварэнне Нацбанка вызначаецца самымі нявыгаднымі курсамі абмена валют.

Фармальна асноўным акцыянерам «РРБ-Банка» з'яўляецца Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця з 25% акцый. Але сапраўдны кіраўнік — гэта бізнэсовец з тыпова беларускім прозвішчам В.Цыбулін. Непасрэдна ён валодае 18% акцый банка, яшчэ 24% належаць падкантрольнай яму фірме «Дыкрыс».

Свой уласны банк мае «Гандлёвы цэнтр «Ждановічы». Назіральную раду рынка, а знача і «Еўрабанк», цяпер узначальвае Віталь Курыла. Цікава, што памочнікам члена савета дырэктароў з'яўляецца Сяргей Яўгенавіч Шыгалаў — сын скандальна вядомага былога кіраўніка «Ждановіч». Нагадаем, што Яўген Шыгалаў быў выпушчаны на свабоду пасля таго, як выплаціў шматмільённую суму і паабяцаў удзельнічаць у пабудове лядовага палаца ў мінскай Чыжоўцы.

«Трастбанк» узначальвае Віктар Шаўцоў — уладальнік бізнэсцэнтраў і музея «Дудуткі». Ягоны банк у свой час быў абвінавачаны амерыканскімі ўладамі ў дапамозе па адмыванні грошай Садама Хусейна, а цяпер банкір пераключыўся на супрацоўніцтва з Іранам і Венесуэлай.

«Тэхнабанкам», які нядаўна аб'яднаўся з Беларускім індустрыяльным банкам, валодае сям'я Кацарэнкаў. Уладзіслаў і Алена сканцэнтравалі ў сваіх руках найбольшую долю акцый. Дарэчы, муж — адзін з намеснікаў Сяргея Гайдукевіча ў Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі.

Расійска-беларускім можна назваць «МТБанк». Яго асноўным акцыянерам (64%) з'яўляецца аўтамабільны холдынг «Атлант-М», афіцыйны дылер кампаній «Форд» і «Фальксваген» у Беларусі. Сярод кіраўніцтва кампаніі — і беларус Алег Хусаенаў, і расіянін Ігар Мальгін. Яшчэ траціна акцый належыць кіпрскай кампаніі Monister Investments Ltd, якая ўваходзіць у склад амерыканскага інвестыцыйнага фонду.

| Велічыня актываў беларускіх банкаў (на 01.01.2010) | | $, млн |
|---|---|---|
| 1 | Беларусбанк | 11 974 |
| 2 | Белаграпрамбанк | 6565 |
| 3 | Белінвестбанк | 1706 |
| 4 | Прыёрбанк | 1691 |
| 5 | БПС-Банк | 1681 |
| 6 | Белзнешэканамбанк | 742 |
| 7 | Белгазпрамбанк | 711 |
| 8 | ВТБ (Беларусь) | 591 |
| 9 | Масква-Мінск | 485 |
| 10 | Белрасбанк | 477 |
| 11 | Альфабанк | 231 |
| 12 | МТБанк | 169 |
| 13 | Парытэтбанк | 121 |
| 14 | Трастбанк | 121 |
| Астатнія банкі — менш за $100 мільёнаў | | |

### Расійскія банкі

На рынак нашай краіны паспелі выйсці, здаецца, усе банкаўскія гіганты Расіі. Падрабязна пра расійскія банкі «Наша Ніва» пісала ў №26 за 14 ліпеня. Цяпер — у сціслым выглядзе.

«Масква-Мінск» кантралюецца ўрадам Масквы і мільянерам Андрэем Барадзіным.

98% акцый «Белгазпрамбанка» належыць расійскаму «Газпромбанку».

Тыя ж 98% акцый мае расійскі «Внешэкономбанк» у беларускім «Белзнешэканамбанку».

«Альфа-банк» знаходзіцца ва ўласнасці алігарха Міхаіла Фрыдмана, які выкупіў яго ў Нацбанка і непальскіх бізнэсоўцаў.

Продаж «Белпрамбудбанка» — гордасць беларускай улады. Пакупнік, расійскі «Сбербанк», выкупіў 93% акцый за $280 мільёнаў.

«Белрасбанк» — на ўсе 100% належыць «Росбанку». Кантрольны пакет акцый расійскага банка мае французская інвестыцыйная група, а рэшту — алігарх Уладзімір Патанін.

«Банк ВТБ» належыць расійцам на 71%.

### Еўрапейскія банкі

З буйных беларускіх банкаў належыць еўрапейцам пакуль што толькі «Прыёрбанк». Ён быў куплены аўстрыйскай фінансавай групай «Райфазэн» параўнальна даўно, яшчэ ў 2003 годзе.

Польская прысутнасць у банкаўскім сектары нашай краіны абмяжоўваецца дзейнасцю малога «Сомбелбанка». Мільярдэр Лешак Чарнецкі і падначалены яму Geting Holding валодае 75% акцый банка.

«Дэльтабанк» мае ўкраінскае паходжанне. Яго ўласнік Мікалай Лагун мае аднайменны банк і на тэрыторыі нашага паўднёвага суседа.

Калі расійскія ўстановы вызначаюцца і колькасцю, і памерам актываў, то швейцарскія — толькі колькасцю. У нашай краіне тры банкі, але ўсе параўнальна невялікія. Гэта «Цэптэр-Банк», на чале якога стаіць уладальнік бізнэс-імперыі Філіп Цэптэр, «БелСвісБанк», якім кіруюць тры акцыянеры — усе швейцарцы, — і «Крэдэксбанк». Дарэчы, апошні з іх да 1 кастрычніка гэтага года павялічыцца, бо ў яго склад увойдзе самы маленькі беларускі банк — Міжнародны рэзервовы банк, які раней належыў кіпрскім бізнэсоўцам.

Пасля хуткага знікнення гэтага банка кіпрскае прадстаўніцтва на тэрыторыі Беларусі застанецца невялікім. Адзіным іграком застанецца сумнавядомы «Абсалютбанк», пра існаванне якога беларусы даведаліся пасля шэрагу гучных рабаванняў абменнікаў банка. Кіпрскія інвестыцыйныя кампаніі валодаюць 88% акцый.

«Беларускі народны банк» яшчэ нядаўна меў на эмблеме вершніка з «Пагоняй» і беларускамоўны назоў. Цяпер эмблема змянілася — ці то на выяву сабакі, ці то на льва. Уладальнік застаўся ранейшым — Банк Грузіі.

Найбольш шматнацыянальны капітал прадстаўлены ў Беларускім банку малога бізнэсу. Сярод акцыянераў — нямецкія, галандскія, шведскія і амерыканскія кампаніі. Інтэрнацыянальны і «ХоумКрэдытБанк» — ён карыстаецца грашыма міжнароднай групы кампаній PPF.

### Азіяцкія банкі

Іранскія грошы круцяцца ў «Анэрбанку» і «ТК Банку». Невялікую частку акцый — 2,39% апошняга — мае аўтамабільная кампанія «Лада ОМС — Холдынг». Банк з прыгожай назвай «Залаты талер» увосень 2008 года быў на 99,9% выкуплены ліванскай кампаніяй Fransaholding. Услед за пакупкай адбылося і перайменаванне ў «Франсабанк».

Нарэшце, «БТА Банк» — дачыннае падраздзяленне аднайменнага казахстанскага банка.

**Яўген Васількоў**

## «Беларуськалій»: перамовы з расійскім мільярдэрам Керымавым не праводзяцца

Расійская газета «Ведомости» паведаміла пра цікавасць расійскага мільярдэра Сулеймана Керымава да куплі акцый «Беларуськалія». Як заявіла выданню крыніца, мільярдэр нядаўна сустракаўся з Аляксандрам Лукашэнкам і ад імя «Уралкалія» прапанаваў купіць кантрольны пакет «Беларуськалія». Паводле інфармацыі крыніцы, за 51% прадпрымальнік прапанаваў $7,5 мільярда.

У «Беларуськаліі» інфармацыю аб перамовах з Керымавым не пацвярджаюць.

У ліку асноўных пакупнікоў акцый «Беларуськалія» раней называлі кітайскі холдынг Sinofert і кампанію China Blue Chemicar.

**ЯВ**

## Сцісла

• **Удзельная вага ценявой эканомікі ў Беларусі складае больш за палову ВУП.** Паводле даследавання Сусветнага банка, у 2007 годзе паказчык дасягнуў 53% і працягваў расці. Найменшы працэнт ценявой эканомікі ў Швейцарыі — 8,6% ад ВУП.

• **З 1 лістапада заробкі бюджэтнікаў узрастуць на траціну.** Чарговае павышэнне тарыфнай стаўкі першага разраду плануецца ў Беларусі з 1 лістапада, паведаміў міністр эканомікі Беларусі Мікалай Снапкоў. Ён адзначыў, што з 1 лістапада тарыфную стаўку першага разраду плануецца павысіць да Br118—120 тысяч рублёў. З 1 чэрвеня тарыфная стаўка першага разраду ўстаноўлена ў памеры Br90 тыс.

• **Расія хоча зарабіць на прыватызацыі $30 мільярдаў.** У план прыватызацыі ўключаныя такія гіганты, як «Роснафта», «Внешторгбанк», «Сбербанк» і іншыя. План па маштабе супастаўны з застаўнымі аўкцыёнамі пачатку 1990-х. Праўда, гэтым разам кантрольныя пакеты акцый кампаній застануцца ў дзяржавы.

• **Авіякампанія «Атлант-Саюз» збанкрутавала.** Кампанія спрабавала наладзіць пералёты ў Маскву з Мінска, Брэста і Гродна. Запазычанасць авіяперавозчыка, які належыць ураду Масквы, складае $390 мільёнаў. Масква мела намер стварыць канкурэнта «Аэрафлоту».

**ЯВ**

# Беларусь прадае еўрааблігацыі ў аб'ёме $600 мільёнаў

Працэнт малавыгадны — 8,75%. Гэта супастаўна з коштам аблігацый Грэцыі.

Пра размяшчэнне еўрааблігацый паведаміў міністр фінансаў Беларусі Андрэй Харкавец. Паводле яго слоў, даходнасць аблігацый склала 8,75%. «Купон 8,75% адпавядае ацэнцы ўсяго рынку. Тут не мы дыктуем палітыку, тут ацэнка інвестараў. Таму мы выходзім з таго, як нас ацэньваюць інвестары і наколькі эфектыўна мы з імі папрацавалі», — заявіў міністр.

Агенцтва Standard і Poor's прысвоіла папярэдні рэйтынг беларускім аблігацыям на ўзроўні B+. «Гэта папярэдні рэйтынг. Ён можа ўдакладняцца па факце выпуску. Гэта стандартная ацэнка, зыходзячы перадусім з ацэнкі эмітэнта», — растлумачыў Андрэй Харкавец.

Савету міністраў Беларусі дадзенае права ў 2010—2011 выпусціць аблігацыі на суму да $2 мільярдаў з тэрмінам абарачэння не менш як 5 гадоў і размяшчэннем іх за межамі краіны. Указ мусіць прыцягнуць замежныя інвестыцыі ў эканоміку. Іх выпуск дазволіць ураду не браць крэдытаў ад МВФ ці Расіі, якія можна атрымаць пад значна ніжэйшы працэнт. Аднак МВФ звязваў выдачу крэдытаў з выкананнем эканамічных, а Масква — палітычна-эканамічных патрабаванняў. У выбарчы год для адміністрацыі Аляксандра Лукашэнкі тое падаецца непрымальным.

Даходнасць беларускіх аблігацый больш чым на 6% вышэйшая за даходнасць аблігацый Нямеччыны (2,2%). Для параўнання таксама, аблігацыі Грэцыі, што балансавала на мяжы банкруцтва, на сёння ідуць пад 11%, хоць яшчэ ў маі—чэрвені размяшчаліся пад 8%, а да гэтага года — пад 3,5%.

Высокае апрацэнтаванне беларускіх аблігацый выклікана як сумневамі ў сярэднетэрміновай стабільнасці беларускай эканомікі, так і навіною: Беларусь выпусціла еўрааблігацыі ўпершыню, а першы блін, як кажа прымаўка, сабаку. Затое важны рынкавы крок зроблены.

**Сяргей Гезгала**

## Не знайшлося сведкаў «лаянкі матам»

Затрыманых у часе ўскладання кветак да помніка Коласу выпусцілі.

27 ліпеня чатыры нацыянальныя актывісты правялі ноч у турме на Акрэсціна.

Чатыры дзясяткі людзей сабраліся ў дваццатую гадавіну абвяшчэння Дэкларацыі незалежнасці на плошчы Якуба Коласа ў Мінску. Планавалася з кветкамі і вершамі рушыць далей да помнікаў Янку Купалу і Максіму Багдановічу.

На плошчы прысутнічалі супрацоўнікі міліцыі ў форме і ў цывільным. Яны цікавіліся, хто галоўны, і зазначалі несанкцыянаваны характар чытання вершаў.

Дваццацігадовая равесніца Дэкларацыі незалежнасці Ірына Губская прачытала верш Уладзіміра Арлова пра незалежнасць. Да помніка Якуба Коласа былі ўскладзены кветкі. Неўзабаве з боку міліцыянтаў адбыўся напад на Рыгора Кастусёва, патэнцыйнага кандыдата ў прэзідэнты ад партыі БНФ.

Пасля затрымалі маладую дзяўчыну Касю Давыдзік. Схапілі і Вячаслава Сіўчыка. Яго спрабавалі абараніць Андрэй Кім і Мікалай Дземідзенка. У выніку ўсе трое апынуліся ў міліцэйскай машыне.

Пратаколы на іх склалі ў апорным пункце Савецкага раёна па артыкуле 17.1 Адміністрацыйнага кодэкса (нецэнзурная лаянка). Ночылі затрыманыя ў ізалятары на Акрэсціна.

Аднак судоў на наступны дзень так і не адбылося.

Начальнік апорнага пункта Савецкага раёна Зміцер Валынцаў разам з намеснікам начальніка РУУС Савецкага раёна Максімам Свірыдам, што кіравалі затрыманнямі 27 ліпеня, заявілі ў судзе, што сведкаў нецэнзурнай лаянкі пакуль прадставіць не могуць.

Праз адсутнасць сведкаў з боку абвінавачання судовыя працэсы былі перанесеныя на 5 жніўня.

**Юльян Місюкевіч**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**КХП-БНФ адновіць памятную шыльду ў Курапатах у суботу**

Ва ўрочышчы Курапаты пад Мінскам, на месцы пахавання ахвяраў сталінскіх рэпрэсій, павалілася памятная шыльда. Драўляныя слупы, на якіх яна стаяла, не вытрымалі. Шыльду плануюць аднавіць у найбліжэйшую суботу. Аб гэтым паведаміў Валер Буйвал, актывіст Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ.

**АП**

## Уладзімір Колас не дазволіў карэспандэнту «НН» прысутнічаць на Радзе інтэлігенцыі

Рада інтэлігенцыі нечым нагадвае масонскую ложу. Усе пра яе чулі, але ніхто не ведае, хто ў яе ўваходзіць і дзе яна збіраецца.

Каб атрымаць адказы на гэтыя пытанні, збіраўся схадзіць на чарговае паседжанне Рады 3 жніўня. Тым больш што якраз яны ўзялі на сябе абавязак па вызначэнні адзінага кандыдата ад апазіцыі.

Загадзя патэлефанаваў кіраўніку Рады Уладзіміру Коласу, каб атрымаць дазвол на прысутнасць. На маё здзіўленне, Колас адразу катэгарычна зазначыў, што не хоча мець з «НН» ніякіх справаў.

«Пасля тых брудных інсінуацый, што вы надрукавалі пра Раду інтэлігенцыі, нічога супольнага мець з вамі не хочам. Вы і так усё ведаеце, што напішаце. Наша справа, каго пускаць на паседжанне, а каго не», — так Колас забараніў нам прысутнічаць.

Колькі разоў журналісты «НН» чулі падобнае «каго хочам, таго і не пускаем» ад дзяржаўных установаў, не злічыць. Цяпер да гэтага шэрагу далучылася Рада інтэлігенцыі. Праз асабістыя крыўды кіраўнікі Рады гатовыя забыць аб прынцыпах галоснасці і адкрытасці, якія самімі ж імі і дэкларуюцца.

Ну а «бруднымі інсінуацыямі» названы каментар рэдактара «Бачылі мы вашы круглыя сталы з Ганчарыкам». Пры гэтым і сам Уладзімір Колас атрымаў слова на старонках газеты.

Сапраўды, нейкая неінтэлігентная гульня Рады інтэлігенцыі атрымліваецца.

**ЗП**

## У ЗША выдадзеная аповесць Быкава «Мёртвым не баліць»




Пераклаў аповесць літаратуразнаўца Джозэф Мозур, у якога гэтая праца заняла апошнія тры гады. З 1983 і да цяперашняга часу Мозур выкладае ва ўніверсітэтах Новага Арлеана, Паўночнай Караліны і Алабамы.

«Уразіў драматызм твораў гэтага пісьменніка, незвычайная шчырасць і праўдзівасць аўтарскага апісання падзеяў вайны», — піша Джозэф Мозур у сваім лісце да журналіста нью-ёркскай газеты «Беларус».

**Лявон К**

**Vasil' Bykau. The Dead Feel No Pain. Novel.** New York: The Edwin Mellen Press, 2010. 365 p.

## У Беларусі будуць сеяць ячмень «Бацька»



PROSTO-FREE.JOURNAL.COM

У жодзінскім Навукова-практычным цэнтры па земляробстве выгадавалі гатунак ячменю «Бацька». Гэта ранняспелы кармавы гатунак. Ён невысокі, кусцісты. Сярэдняя ўраджайнасць 58,3 ц/га, максімальная — 103,4 ц/га. Уключаны ў Дзяржаўны рэестр для вырастання ў рэспубліцы з 2009.

Варта адзначыць, што ў спісе прадукцыі жодзінскага Навукова-практычнага цэнтра па земляробстве сустракаецца нямала беларускіх назваў. Гэта гатункі азімай пшаніцы «Узлёт», азімага трыцікале «Міхась» і «Гонар», піваварнага ячменю «Гасцінец», «Сталы» і «Талер», кармавога ячменю «Гонар» і «Бурштын». Разам з «Бацькам» у рэестр трапілі гатункі кармавога ячменю «Ладны» і «Зубр». Ёсць свой «Бацька» і ў нашых паўднёвых суседзяў. Украінскія селекцыянеры далі назву «Батько» гатунку азімай пшаніцы.

Аднак у Беларусі назва «Бацька» адразу набывае двухсэнсоўнае гучанне.

**Сямён Печанко**

## Урачыстасці ў гонар Ларысы Геніюш у Зэльве

7 жніўня ў Зэльве адзначаць 100-годдзе пісьменніцы.

Урачыстасць пачнецца а 10-й гадзіне ў мясцовай Троіцкай царкве з памінальнай малітвы. У храме адкрыюць выставу, прысвечаную жыццю і творчасці пісьменніцы.

Затым землякі і госці мерапрыемства возьмуць удзел у адкрыцці мемарыяльнай шыльды на доме на Савецкай вуліцы, дзе з 1956 да 1983 жылі Ларыса і Янка Геніюшы.

А 14-й гадзіне ў Зэльвенскім РДК пройдзе літаратурная імпрэза з прэзентацыяй двухтомнага збору твораў Геніюш і біяграфічнага альманаха «Асоба і час», цалкам прысвечанага ёй.

У першы том збору твораў увайшлі вершы і паэмы, скампанаваныя храналагічна. Другі том складаецца з прозы і эпісталярнай спадчыны. Гэта аўтабіяграфічны нарыс «Сто ранаў у сэрца», які ў кніжных выданнях не друкаваўся, дакументальная аповесць «Споведзь», 160 лістоў паэткі да знаёмых і сяброў.

Завершацца юбілейныя ўрачыстасці на зэльвенскіх могілках, дзе ўскладуць кветкі і вянкі да магілаў Ларысы і Янкі Геніюшаў.

**«Рэгіянальная газета»**

# Беларускіх вайскоўцаў накіруюць у Ліван

**Але ў баявых аперацыях яны ўдзельнічаць не будуць.**

Аляксандр Лукашэнка 2 жніўня падпісаў указ №400 «Аб накіраванні ваеннаслужачых для ўдзелу ў дзейнасці па падтрыманні міжнароднага міру і бяспекі ў Ліванскай Рэспубліцы». Дзевяць беларускіх вайскоўцаў возьмуць удзел у місіі ААН у якасці афіцэраў штаба, дактароў, а таксама спецыялістаў па вайскова-грамадзянскім узаемадзеянні. У баявых аперацыях беларусы ў Ліване ўдзельнічаць не будуць.

Беларусь мае права пасылаць вайскоўцаў у зоны канфліктаў па лініі ААН. Іншая магчымасць апынуцца ў «гарачым пункце» для беларусаў прадугледжаная ўдзелам у Арганізацыі дамовы аб калектыўнай бяспецы.

«На дадзены момант АДКБ не праводзіць ніякіх міратворчых аперацый, — кажа палітолаг Дзяніс Мельянцоў. — Але нават калі б і праводзіла, то наўрад ці Лукашэнка пагадзіўся б пасылаць туды беларускіх міратворцаў. Асабліва ўлічваючы інфармацыйную вайну з Крамлём. Адзінае месца ў СНД, дзе зараз магчымае правядзенне міратворчай арганізацыі — гэта Кыргызстан. А там Беларусь не мае важных інтарэсаў, адпаведна няма неабходнасці нашай прысутнасці там.

А вось на Блізкім Усходзе Беларусь мае інтарэсы. Перадусім у супрацоўніцтве з Сірыяй. Таму і быў выбраны вектар ААН. Гэта добрая магчымасць для Беларусі заявіць аб сваім удзеле ў праграмах ААН і адначасова развіваць кантакты ў рэгіёне. Для вайскоўцаў удзел у міратворчых аперацыях — магчымасць атрымаць неабходны досвед».


**У зоне дзеяння міратворцаў ААН у Ліване ў 2006-м ішлі крывавыя баі.**

Міратворчая місія ААН у Ліване прысутнічае ад сакавіка 1978 года. Міратворчы кантынгент ААН кантралюе поўдзень краіны, дзе асабліва моцныя пазіцыі «Хезбалы» — ваенізаванай арганізацыі, што выступае за стварэнне ў Ліване ісламскай дзяржавы, а таксама стаіць на рэзкіх антыізраільскіх пазіцыях. Ізраільскі бок пастаянна абвінавачвае міратворчую місію ААН у Ліване ў супрацоўніцтве з «Хезбалой». Не абыходзіцца і без ахвяр з боку міратворцаў. Падчас апошняй вайны, у ліпені 2006 года, ВПС Ізраіля памылкова разбамбілі адзін з пастоў міратворчага кантынгенту ААН. Загінулі чатыры прадстаўнікі місіі — грамадзяне Аўстрыі, Кітая, Канады і Фінляндыі.

**Алесь Пілецкі**

## Дзяўчатам паступіць у Акадэмію МУС удвая цяжэй

**Закончылася залічэнне ў ВНУ на дзённую бюджэтную форму навучання.**

Самыя высокія прахадныя балы — у БДУ. У лідэрах спецыяльнасці факультэта міжнародных адносін: «Міжнароднае права» (369 — горад, 348 — вёска), «Сусветная эканоміка» (360).

Мяжу ў трыста балаў пераступілі і іншыя сталічныя ВНУ: у Лінгвістычным універсітэце па спецыяльнасцях «Англійская мова і другая мова са спецыялізацыяй» (355), «Нямецкая мова і другая мова са спецыялізацыяй» (347/173). У БДУІР гэта спецыяльнасці «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій»(314), «Інфарматыка» (326/318). У Медыцынскім — стаматалагічны факультэт (343/336).

У БНТУ самы высокі бал быў на аўтатрактарным факультэце на «Транспартную лагістыку» (289/283), «Сусветную эканоміку» (289/266) і «Бізнес-адміністраванне» (298/229) факультэта маркетынгу, менеджменту і прадпрымальніцтва.

У Тэхналагічным найвышэйшыя прахадныя балы на «Выдавецкую справу» (276).

У Акадэміі МУС самыя высокія — на міліцэйскі факультэт «Для патрэбаў Дзяржаўнага памежнага камітэта» (169). А вось для дзяўчат балы зашкальвалі. На спецыяльнасць «Судовая экспертыза» маладым людзям было дастаткова набраць 169 балаў, а дзяўчатам — 365.

Сёлета 55 ВНУ Беларусі плануюць прыняць 103 тысячы абітурыентаў на ўсе формы навучання. Толькі траціну з іх — на бюджэт.

**Кастусь Матушыч**

# Мінск — адно з самых прывабных месцаў Еўропы?

**Lonely Planet уключыў Мінск у топ−10 найлепшых месцаў для адпачынку ва Усходняй Еўропе.**

Першае месца ў рэйтынгу Lonely Planet займаюць Юлійскія Альпы з адзіным у Славеніі нацыянальным паркам Трыглаў. Потым ідуць сталіца Босніі і Герцагавіны Сараева, харвацкая выспа Млет, гісторыка-археалагічны комплекс Стары Архей у Малдове, Талін, чэшскі замак-крэпасць Локет, польскі Торунь, славацкі Здар і Рыга. Замыкае дзясятку найлепшых ўсходнееўрапейскіх месцаў для турыстаў Мінск.

Вось як апісвае прызнаны аўтарытэт у свеце даведнікаў беларускую сталіцу:

«Мінск амаль напэўна здзівіць вас. Сталіца Беларусі, насуперак сваёй панылай рэпутацыі, здзівіць вас як прагрэсіўнае і сучаснае месца. Тут стылёвыя кавярні, рэстараны з wi-fi, а таксама перапоўненыя бары і начныя клубы. Сушы-бары і карцінныя галерэі размяшчаюцца проста ў цэнтры горада, які быў у свой час цалкам перароблены ў адпаведнасці з густамі Сталіна. У горадзе параўнальна мала традыцыйных славутасцяў, затое — незлічоная колькасць цікавых месцаў для тых, хто зачараваны савецкім перыядам, і месцаў, дзе можна не толькі адчуць сябе як дома, але і павесяліцца, калі ў горад прыходзіць ноч».

Цікава, што ў якасці пацвярджання турыстычнай прывабнасці Мінска складальнікі рэйтынгу выбралі фатаграфію будынка Палаца Рэспублікі. На фоне пейзажаў славенскіх Юлійскіх Альпаў і стыльнага рыжскага «Дома Чарнагаловых» мінскае манументальнае збудаванне выглядае вельмі сціпла.

З іншага боку, Lonely Planet разбіраецца ў даведніках. Можа быць, замежнікі сапраўды ў захапленні ад сталічнага «саркафага»?

**tio.by**

# У Швейцарыі сабраныя першыя вагоны для мінскай «гарадской электрычкі»

Першы электрацягнік, сабраны для Мінска швейцарскай кампаніяй Stadler, прыбудзе ў Беларусь ужо ў студзені 2011 года.

Электрацягнік даставяць са Швейцарыі на шасці грузавіках, даўжыня кожнага з якіх складзе 34 метры, вышыня 5 метраў. Перадэксплуатацыйныя выпрабаванні цягнік пройдзе ў лакаматыўным дэпо ў Баранавічах, пасля чаго яго перавязуць у Мінск.

Паводле інфармацыі БЧ, у зборцы цягніка возьмуць удзел беларускія спецыялісты маторавагоннага дэпо сталіцы, якія адправяцца ў Швейцарыю для дэталёвага азнаямлення з вытворчасцю гэтай тэхнікі. Там жа пройдуць навучанне беларускія машыністы, якія будуць кіраваць новымі цягнікамі.

Кантракт на куплю дзесяці сучасных электрацягнікоў са швейцарскай кампаніяй Stadler БЧ заключыла ў межах праекта «Гарадская электрычка». Кошт кожнага цягніка — 6 мільёнаў еўра. Шэсць цягнікоў злучаць станцыі Мінск-Пасажырскі і Ждановічы, чатыры будуць працаваць на рэгіянальных маршрутах. У перспектыве плануецца, што гарадская электрычка злучыць сталіцу з гарадамі-спадарожнікамі.

Чакаецца, што першая электрычка будзе запушчаная ў 2011 годзе.

**БелаПАН**

**ГУЧНАЯ СПРАВА**

## Забойцу жонкі пасадзілі на 14 гадоў

**Суд Заводскага раёна Мінска даў 14 гадоў пазбаўлення волі мужу за забойства жонкі, доктаркі дзіцячай паліклінікі.**

Адбываць пакаранне ён будзе ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Забойства адбылося 6 лістапада ў пад'ездзе дома, дзе жыла сям'я. Следства ўстанавіла, што па дарозе дадому між мужам і жонкай адбылася сварка на глебе рэўнасці. Жонка вінаваціла мужа ў здрадзе. У пад'ездзе муж некалькі разоў ударыў жонку галавой аб металічныя ўваходныя дзверы. Ад траўмаў 31-гадовая жанчына памерла на месцы. Мужчына спрабаваў схаваць датычнасць да забойства і зрабіць алібі, пайшоў у краму. Вярнуўшыся на месца здарэння, выклікаў міліцыю, паведаміўшы, што невядомыя забілі яго жонку і скралі мабільны тэлефон. У ходзе следства датычнасць абвінавачанага да забойства была даказаная. У сям'і засталіся двое дзетак — чатырох і дзевяці гадоў.

**БЕЛТА**

# У Гродне можа з’явіцца вуліца Вольгі Корбут

Пра гэта стала вядома падчас сесіі дэпутатаў гарадскога Савета, паведамляе гродзенскі блог s13. Акрамя таго, паступіла прапанова прысвоіць яе імя гімнастычнаму комплексу, што размешчаны на вуліцы Ажэшкі, дзе займалася спартсменка.

У жніўні або верасні чакаецца прыезд алімпійскай чэмпіёнкі ў родны горад. Тут ёй уручаць пасведчанне аб прысваенні тытула «Ганаровы грамадзянін» і прэмію ў памеры 20 базавых велічынь.

Нагадаем таксама, што ў канцы чэрвеня гарадская тапанімічная камісія пастанавіла разгледзець пытанне аб з’яўленні ў абласным цэнтры вуліцы імя Васіля Быкава. Аднак прапанова камісіі дагэтуль застаецца без разгляду.

**АП**

## Здарэнні сцісла

• **Галоўны бухгалтар Нацыянальнага архіва падазраецца ў крадзяжы 116 млн рублёў.** Яе падазраюць у тым, што ў 2000—2009 гадах яна аформіла на працу вядучымі архівістамі і інжынерамі людзей, у тым ліку без вышэйшай адукацыі. На працу яны не выходзілі, але зарплата ім налічвалася. Шкода склала 116 мільёнаў рублёў. Ідзе следства.

• **Кіроўца «БМВ» справакаваў аварыю з трох машын і ўцёк.** Аварыя адбылася на 32 км мінскай кальцавой. Кіроўца «Рэно Эспас» — жанчына 1957 года нараджэння — не дала рады кіраванню і сутыкнулася з аўтамабілямі «Хонда Акорд» і «Опель Вектра». У выніку «Хонда» ўрэзалася ў дарожную агароджу, а «Рэно» перакулілася. Жанчыну з «Рэно» прывезлі ў бальніцу з закрытай чэрапна-мазгавой траўмай. Паводле сведак, у аварыі вінаваты аўтамабіль «БМВ», які рухаўся па МКАД на вялікай хуткасці і падрэзаў «Рэно». Нумароў «БМВ» ніхто не запомніў.

• **Выкладчык браў хабар падносамі.** Выкладчык матэматычнага факультэта Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Скарыны арыштаваны па падазрэнні ў атрыманні хабару ад студэнтаў. Выкладчык працаваў на кафедры эканамічнай кібернетыкі і тэорыі верагоднасці. Ён устанаўліваў сувязі з адным са студэнтаў групы і прасіў даведацца, хто баіцца здаваць залік або сумняваецца ў сваіх ведах. Студэнт складаў спіс. Групу «льготнікаў» выкладчык разбіваў на падгрупы. Кожнай ён даваў пісьмовае заданне з указаннем, што яму трэба і ў якім магазіне, за якую цану гэтую рэч трэба купіць. Да прыкладу, выкладчыку прыглянуўся паднос «з роспісам чырвонымі ружамі» коштам 170 тыс. рублёў, у іншым магазіне яму спадабалася «інкруставаная шкатулачка». Следчым затрыманы патлумачыў, што з’яўляецца аматарам мастацтва і даўніны.

• **Гродзенец паспрачаўся з дзяўчынай, што пакажа стрыптыз на вуліцы.** Цэлую гадзіну студэнткі назіралі з вокнаў інтэрната, як мужчына здымаў шорты, задзіраў кашулю і круціў клубамі. Калі з’яўляліся мінакі, ён хаваўся ў кусты. Праз гадзіну, нагледзеўшыся на стрыптыз, студэнткі паведамілі вахцёру пра незнаёмца. Вахцёр выклікаў міліцыю. Хуліганам аказаўся 40-гадовы мужчына, які прыехаў у інтэрнат да сваёй дзяўчыны. Студэнтка выпіла віна і пайшла з кавалерам у заклад, што ён не зможа выйсці на вуліцу голым.

• **У Хоцімску мужчына проста так збіў школьніка.** П'яны 55-гадовы мясцовы жыхар па невядомай прычыне ўдарыў у грудзі 13-гадовага хлопчыка, які ехаў на ровары. Ад удару дзіця ўпала, пры гэтым разбіўшы мабільны тэлефон. Прыйшоўшы дахаты, ён расказаў пра здарэнне бацькам, якія паведамілі ў міліцыю.

• **Наглядчыца полацкага музея паўгода крала выручку.** Наглядчыца аднаго з філіялаў Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка паўгода крала выручку за квіткі і сувеніры. Каб схаваць факт крадзяжу, па справаздачах яна паказвала наяўнасць грошай. За паўгода жанчына здолела скрасці больш за 15 млн руб. Палачанка асуджаная на два гады турмы з канфіскацыяй.

**СМ**

# Заробкі малыя, бо клопат пра народ вялікі

**Некалі было: я народ за цывілізаваным светам не паваду! Сёння: я вам хоць заўтра зраблю тут Еўропу, але ж вы самі не гатовыя! Піша Аляксандр Класкоўскі**

Перад выбарамі ідзе ў ход звыклы папулісцкі інструментарый. Нават адставанне ад еўрапейскіх заробкаў афіцыйны кіраўнік тлумачыць... клопатам пра народ.

«Калі народ хоча атрымліваць паўтары-дзве тысячы даляраў заробку, давайце дамо, але за паслугі будзеце плаціць рэальную цану, — заявіў Лукашэнка 31 ліпеня на Нарачы. — Мы можам зрабіць, як у Еўропе, але тады будзеце, як і ў іх, плаціць поўны кошт».

Такія заявы робяцца з жалезным разлікам на тое, што просты люд жахнецца і будзе маліць: бацька родны, толькі ж не аддавай на згубу бязлітаснаму капіталізму!

Беларусы сапраўды вялікія патэрналісты. Многія падселі на фальшывы сацпакет. Гэта бачна няўзброеным вокам і пацвярджаецца сацыялогіяй. Лепей казённая сініца ў руцэ, чым ліберальна-рынкавы жораў у небе.

І ў гэтым каласальная праблема для апазіцыйных кандыдатаў. Лозунгі рынкавых пераўтварэнняў не грэюць, а хутчэй натапырваюць паспалітый люд. Спаборнічаць жа з дзейным кіраўніком на папулісцкім полі — тым болей глухі нумар.

Дасведчаны адмысловец разаб'е яго рыторыку як двойчы два. За чый кошт фармуецца той бясплатны сацпакет, якім казырае Лукашэнка? У дзяржавы няма іншых грошай, акрамя тых, што яна забірае ў нас ці недаплачвае нам. На тых сацпакетах сядзіць плойма чыноўнікаў-пераразмеркавальнікаў, да чыіх рук прыліпае ладная доля дабротаў.

Так што сапраўды лепей даць людзям па дзве тысячы ды скараціць палову апарату. Але ж менавіта пагроза ўсеўладдзю вертыкалі і тармозіць трансфармацыю пераразмеркавальнай беларускай мадэлі.

**У дзяржавы няма іншых грошай, акрамя тых, што яна забірае ў нас.**



SVABODA.ORG

Адно паказальна: апраўдваць яе ўсё цяжэй. І еўрапейскі чыннік міжволі ўлазіць у парадак дня Лукашэнкі. Некалі было: я народ за цывілізаваным светам не паваду! Сёння: я вам хоць заўтра зраблю тут Еўропу, але ж вы самі не гатовыя!

«Таму, калі вам гавораць, што ў нас нешта не так, не па-еўрапейску, гэта не са мной звязана — толькі з вамі звязана», — казаў афіцыйны кіраўнік. Фактычна гэта перадвыбарны дыспут Лукашэнкі з апазіцыяй. І ён мусіць апраўдвацца.

Паўзучая еўрапеізацыя масавай свядомасці чым далей, тым болей будзе падціскаць уладу.

# Беларусь — расійскі Ізраіль

**Беларускае кіраўніцтва будавала адносіны з Расіяй на ўзор амерыканска–ізраільскага хаўрусу. Піша Сяргей Богдан.**

Надоечы расійскі прэм'ер Пуцін намякнуў, маўляў, Беларусі «хочацца атрымаць штосьці на дурняк ад Расіі, а калі не выходзіць, узнікае раздражненне». Аднак расійскі бок дэманструе нашмат большае жаданне мець ад Беларусі істотныя палітычныя і стратэгічныя выгады і нічога за іх не плаціць.

Расійскія СМІ кажуць, што беларускае кіраўніцтва сваімі інтэграцыйнымі абяцанкамі толькі выманьвала ў Масквы эканамічныя выгады. Маўляў, нафта ўзамен на братэрскія пацалункі. Аднак яны забываюць, што і Расія мела з таго істотную для сябе карысць — кавалак імперскага прэстыжу. У той час як ад Расіі сыходзілі ўсе, хто толькі мог сысці, Мінск паслужліва іграў ролю васала. Наколькі важна гэта было для расійскай эліты — цяжка ўявіць сабе чалавеку з неімперскай нацыі.

Сяброўючы з Расіяй, Беларусь і сама плаціла высокую цану. Бо яна выбрала расійскую арыентацыю на шкоду іншым верагодным варыянтам — накшталт нейтральнасці або руху ў напрамку Еўрасаюза і НАТО.

Баланс выгады ды стратаў ад хаўрусу з Крамлём выглядае ўсё менш апраўданым. Расійскае кіраўніцтва спадзяецца, што Лукашэнку няма куды падацца пасля таго, што ён (з маскоўскай дапамогай) зрабіў з беларускай палітыкай і палітычнай сістэмай пасля рэферэндуму 1996 года. Але, праўдападобна, Лукашэнка ўжо наладжвае сувязі з апанентамі і канкурэнтамі Расіі. Тым не менш, Расія ўпарта спрабуе ставіць на шантаж і бізун і скваплівае на перніках.

Публіцыст выдання «Газета.ru» Віталь Портнікаў падагульніў сітуацыю: Расія не гатовая плаціць за сваю імперыю. Анягож, імперыя — гэта не толькі эксплуатацыя падданых і фанфары на парадах, але і пэўныя намаганні з боку імперскага цэнтра ды дамоўленасці з саступкамі. Масква хоча мець усе выгады імперыі і не траціцца на яе. Аднак прызнаць тое не спяшаецца.

Салжаніцын калісьці роспачна ўсклікнуў: «Няма ў нас сілаў на Імперыю! — і не трэба, і хай зваліцца яна з нашых плеч: яна трушчыць нас, і высмоктвае, і прыспешвае нашу гібель», праўда, маючы на ўвазе неславянскія землі. Цяпер прыйшоў час расейцам адмовіцца і ад Беларусі з Украінай.

Адначасова з тым і Лукашэнку даводзіцца перажыць паступовы балючы працэс адмовы ад уласнага бачання Беларусі ў арбіце Расіі. Заснаўшы ў самым пачатку 2000-х паразу ў мегапраектах аднаўлення СССР, пабудовы геапалітычных восяў ад Пекіна да Гаваны ды заваёвы Крамля, беларускае кіраўніцтва пачало схіляцца да пабудовы адносінаў з Расіяй на ўзор амерыканска-ізраільскага хаўрусу.

Летась у гутарцы з Праханавым беларускі кіраўнік наўпрост заклікаў да пераймання ізраільскай мадэлі: «Амерыканцы фінансуюць Ізраіль, выдаючы столькі крэдытаў, колькі тыя могуцьператравіць, а потым іх спісваюць. ...Мы ж для вас больш, чым Ізраіль для Амерыкі. Мы — частка вашае абароны, частка вашае бяспекі».

**Масква хоча мець усе выгады імперыі і не траціцца на яе.**

Матывацыя яго здаецца зразумелай. Параўноўваць глабальную вагу Беларусі і Расіі ў эканамічным, палітычным ды іншых вымярэннях недастаткова для разумення беларуска-расійскіх адносінаў, як і параўноўваць вагу ЗША і Ізраіля. Бо нашмат большае значэнне будуць мець эмацыйныя повязі. Таму, мяркуе кіраўніцтва Беларусі, чаму мы не можам мець бясконцы крэдыт, дапамогу і бязмежнае дараванне ад Крамля?

І тут беларускі лідэр пралічыўся. ЗША ніколі не паставяць пад сумнеў незалежнасць Ізраіля і яго самастойнасць у палітыцы, успрымаючы яго як найбліжэйшую, але іншую краіну. А для расійцаў Беларусь — адламаны кавалак іх імперыі. Як Косава для Сербіі.

На гэта накладаецца яўная слабасць беларускага лобі ў Маскве, якое павінна было б ператвараць тыя сантыменты ў палітычныя дзеянні. Мінск пацярпеў паразу і ў сваёй стаўцы на рэгіянальныя расійскія эліты, і ў сваёй падтрымцы расійскіх правых рэваншыстаў. Зрэшты, ён ніколі і не меў шанцаў стварыць сваё лобі ў Маскве, бо і дагэтуль яму бракуе замежнапалітычных кадраў і экспертызы.

Разважаць пра шкоднасць ці аблуднасць такой замежнай палітыкі Лукашэнкі бессэнсоўна дый проста позна. Ён выбраў адну з опцыяў, вызначаючы замежнапалітычны курс і прывязваючы яго да сваіх унутрыпалітычных амбіцыяў. Але і ўспрымаць прастадушна кпіны расійскага прэм'ера з «халяўшчыкаў»-беларусаў не варта. Бо за ўсё, што Расія дала ў 1990-х і 2000-х, Мінск заплаціў «з кортарам». І Расія атрымала за свае «дарункі» тое, што ёй было патрэбна. Таму гэта быў узаемна выгадны абмен таварамі і паслугамі. Усё мела сваю цану, а прададзены тавар назад не вярнуць.

# Дваццаць гадоў Незалежнасці: што зроблена?

**Параўнаем набыткі беларускай незалежнасці з пачаткамі Другой Рэчы Паспалітай.**

Прайшло два дзесяцігоддзі ад прыняцця Вярхоўным Саветам тады яшчэ БССР Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце і амаль дзевятнаццаць гадоў, як мы фактычна жывём у незалежнай краіне. Прыкладна столькі часу землі Заходняй Беларусі знаходзіліся ў складзе Другой Рэчы Паспалітай. Таму хацелася б параўнаць, што зрабіла за гэты прамежак тагачаснае польскае кіраўніцтва, з тым, што зроблена ў нас за апошнія два дзесяцігоддзі.

Адраджэнне польскай дзяржавы ў 1918 годзе, як і адраджэнне незалежнай Беларусі, стала магчымым пасля развалу імперыі: тады царскай, цяпер савецкай. Палякам дасталася горшая спадчына. Тэрыторыя краіны больш за сто гадоў была падзеленая паміж Прусіяй, Аўстрыяй і Расіяй. Па яе тэрыторыі чатыры гады праходзілі ваенныя дзеянні Першай сусветнай вайны. Амаль тры гады лінія фронту праходзіла па Заходняй Беларусі. Потым гэтая тэрыторыя некалькі разоў пераходзіла з рук у рукі то да немцаў, то да бальшавікоў, то да палякаў. І толькі пасля савецка-польскай вайны 1920-га пачало адраджацца мірнае жыццё. Але ніхто з тагачасных палітыкаў не рабіў кар'еры на настальгіі па імперыі. Польскасць адраджалася ва ўсіх сферах жыцця. У нас жа цяперашні рэжым усталяваўся, дзякуючы настальгіі вялікай часткі насельніцтва па савецкім мінулым.

Калі параўнаць эканамічныя ўмовы, якія дасталіся Другой Рэчы Паспалітай і незалежнай Беларусі, параўнанне будзе не на карысць палякаў. Гаспадарка была паралізаваная ў выніку ваенных дзеянняў. У выніку ўтварэння новай дзяржавы і развалу імперыі былі парушаныя ўсе эканамічныя сувязі. Тым не менш, гаспадарка краіны здолела хутка адрадзіцца, дзякуючы прыватнай ініцыятыве і патрыятычным настроям палітычнага кіраўніцтва (вядома, патрыятызму польскаму). У нас жа у 1990-я ад кіраўнікоў розных рангаў толькі і чулася, што ва ўсіх бедах вінаваты развал СССР і тыя людзі, што да гэтага спрычыніліся.

Тагачасная Польшча шмат увагі аддавала развіццю адукацыі і культуры, вядома ж, зноў не беларускай. І таму пацверджанне можна знайсці нават сёння. Многія этнічныя беларусы, зазнаўшы таго ўплыву, зрабіліся палякамі па культуры. За гады беларускай незалежнасці сфера ўжывання беларускай мовы ўвесь час скарачаецца. Асноўныя дзяржаўныя газеты (акрамя «Звязды») выходзяць па-расейску, беларускай мовы амаль няма на дзяржаўным тэлебачанні, справаводства па-беларуску няма. І гэта пасля дваццаці гадоў незалежнасці?!

Шмат напісана, што палякі ўціскалі беларусаў, душылі развіццё нашай культуры. Дык гэта ж палякі, яны абаранялі інтарэсы сваёй дзяржавы. А інтарэсы якой дзяржавы абараняе ўлада Рэспублікі Беларусь, калі за патрабаванне даведкі на роднай мове цябе могуць не тое што прынізіць, а нават аштрафаваць? Ды што там даведку, пацярпець у нас можна нават проста за размову на роднай мове.

Такія вось сумныя думкі падчас дваццацігоддзя прыняцця Дэкларацыі аб незалежнасці...

**Зміцер Лупач, Глыбокае**

# Хутка будзе як у Афрыцы

## Сярэдняя тэмпература ліпеня аказалася рэкордна высокай.

За сотню гадоў назірання такой гарачай сярэдзіны лета яшчэ не было.

А жнівень паддае жару. На ўсходзе краіны ў наступныя дні чакаецца да 38—40 градусаў!

Найгоршае чакае Усходняе Палессе, Падняпроўе і Пасожжа. У Гомелі на сераду і чацвер абяцаюць плюс 38, у пятніцу — 39, а ў суботу — 40! Нават ночы не прынясуць палёгкі, бо паветра будзе астываць толькі да 24—25 градусаў.

Такія тэмпературы звыклыя для пустыняў, але не для Беларусі з яе ўмераным кліматам.

Асаблівай спёкаю адзначацца пятніца і субота — тэмпературы 35—40 градусаў прагназуюцца на большай частцы тэрыторыі. Лагаднейшыя дні чакаюцца толькі ў заходняй частцы Беларусі.

У нядзелю гарачыня троху пачне спадаць, але не ўсюды: сквар распаўсюдзіцца на Панямонне.

Як патлумачыла галоўны сіноптык Гідраметэацэнтра Вольга Фядотава, гарачыня да нас ідзе з боку Азіі — з Міжземнага мора. Над Усходняй Еўропаю навіс магутны антыцыклон. Зона вялікага ціску не дае прабіцца да нашых земляў халоднаму паветру з Атлантыкі.

У ліпені медыкі канстатавалі павелічэнне колькасці выпадкаў праблемаў са здароўем, асабліва ў сардэчнікаў. Парушыўся і працоўны рытм: прыватнікі адпусцілі работнікаў, на дзяржпрадпрыемствах скарочаны працоўны дзень.

Сіноптыкі не звязваюць анамальную спёку з глабальным пацяпленнем. Справа ў размеркаванні тэмпературнага рэжыму. «Зімой у нас тэмпература была ніжэйшай за норму, цяпер вышэйшая. У Лацінскай Амерыцы цяпер назіраюцца рэдкія для мясцовага клімату маразы,» — паведаміла В.Фядотава.

Толькі нам ад таго не лягчэй.

**Юльян Місюкевіч**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Прагноз тэмператураў дня**

| Горад | чацвер | пятніца | субота | нядзеля |
|---|---|---|---|---|
| Мінск | 30 | 36 | 36 | 25 |
| Гомель | 38 | 39 | 40 | 37 |
| Гродна | 27 | 32 | 29 | 34 |
| Брэст | 33 | 34 | 26 | 26 |
| Магілёў | 33 | 37 | 37 | 31 |
| Віцебск | 31 | 37 | 38 | 36 |

Крыніца: gismeteo.by

# Сумны рэкорд
## за лета патанула 820 беларусаў

### Палова тапельцаў плавалі выпіўшы.

Год рэкордны, на жаль, не толькі ў спёцы — за лета ўтапіліся 820 беларусаў, з іх 62 дзіцяці. Для параўнання, за 2009 год у вадзе загінула 519 чалавек.

Паводле звестак Таварыства ратавання на водах, самай «небяспечнай» вобласцю стала Віцебская — 154 тапельцы, а найменшыя лічбы ў Гродзенскай — 78. Летась на Віцебшчыне загінула 98 чалавек, і гэта быў абсалютны максімум па краіне.

Ратуючыся ад спёкі, людзі купаюцца ў забароненых месцах — кар'ерах, пажарных вадаёмах, — патлумачылі ў Таварыстве ратавання на водах. Палова ад усіх здарэнняў на вадзе адбываецца пры купанні ў нецвярозым стане. Вадаёмы хоць лічацца грамадскім месцам, але ўжыванне алкаголю на іх амаль не кантралюецца, хаця гэта было б пажадана, у першую чаргу, для бяспекі саміх аматараў алкагольных напояў. З іншых прычын вылучаюцца: прыступы хваробы, недагляд бацькоў за дзецьмі, пры рыбалцы.

Шмат людзей тоне на глыбіні, бо не зважае ўвагі на буйкі, а шмат хто лічыць заплыць за іх і плаваць там справай гонару, дый матывуе гэта тым, што за буйкамі купацца нашмат прасцей — ніхто не перашкаджае, а ў зоне «дазволенай глыбіні» шмат народу.

Які з вадаёмаў можна лічыць самым небяспечным па колькасці тапельцаў — невядома, статыстыка не вядзецца. Спецыялісты раяць пазбягаць невядомых вадаёмаў, асабліва гэта датычыцца аматараў ныраць — ні ў якім разе нельга рабіць гэта ля гідразбудаванняў.

**Юрась Ускоў**

# Тарнада пад Бабруйскам?

### Дакументальных пацвярджэнняў няма.

Відавочцы зафіксавалі тарнада ў раёне вёскі Цітаўкі пад Бабруйскам. Як піша газета «Могилевские ведомости», з'ява была зафіксаваная ў адзін з ліпеньскіх дзён.

Відавочцы кажуць, што ўсё вакол рэзка пацямнела, сонца закрылася пылавой хмарай. Ад смерча ішоў ледзяны холад. Слуп паветра ўзняў і перанёс на іншае месца некалькі валуноў вагой каля трыццаці кілаграмаў. Затым тарнада перамясціўся да лесапасадкі, зламаў некалькі дрэваў і знік.

Першы ў гісторыі зафіксаваны тарнада ў Беларусі? Не факт. Вартых даверу фотаў няма, не знойдзена і пэўных матэрыяльных слядоў з'явы. Можа, людзі проста зблыталі тарнада са звыклым ураганам.

Тарнада характэрныя для тэрыторый, на якія ўплывае вільготны трапічны клімат. Што іх выклікае — да канца няясна. Слуп, які нішчыць і ўсмоктвае ўсё, што сустракае на шляху, утвараюць паветраныя масы, якія рухаюцца з рознай хуткасцю на рознай вышыні.

**Алесь Пілецкі**

# Спёка ўсушыла ўраджай

### Беларусь збярэ менш за восем мільёнаў тон збожжа.

Як чакаецца, сёлета ў Беларусі намалоцяць 7,5 млн т збожжа з дапамогай сельгаспрадпрыемстваў і каля 0,5 млн т на прыватных падворках, заявіў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчу Васіль Паўлоўскі. Гэта на 2 млн менш, чым было запланавана. Летась зерня сабралі 8,5 млн т.

Намеснік міністра спасылаецца на ўплыў анамальнай спёкі. Сярэдняя ўраджайнасць па стане на 3 жніўня складала 30,6 ц/га — на 8,7% менш, чым летась.

Найбольшыя ўраджаі, як звыкла, на Гродзеншчыне — 42,7 ц/га.

Ураджай збожжавых у Расіі сёлета скароціцца на 20—25%. Там паўплывала не проста спёка — анамальная суша. Гэта, аднак, не пагражае галадам: дзякуючы леташняму ўраджаю, Расія назапасіла гіганцкія рэзервы.

Процілеглая сітуацыя назіраецца ва Украіне. Тут чакаюць рэдкасна добры ўраджай. Увесну гаварылі пра 40 млн, а цяпер прагнозы павысілі да 43—45 млн т.

**Сямён Печанко**

# NASA перадае:
## на Сонцы магутны выкід плазмы

### Наступствы яго Зямля адчуе 4 жніўня.

1 жніўня на Сонцы адбыўся магутны каранальны выкід плазмы (зараджаных часціцаў), паведамляецца ў прэс-рэлізе на сайце NASA. Цяпер з велізарнай хуткасцю да зямлі рухаецца сонечная плазма. Ці чакае нас сур'ёзная магнітная бура і якія могуць быць наступствы для чалавечага арганізма?

«Мы з вамі не заўважым гэтага выкіду, — кажа Аляксандр Шымбалёў, выкладчык астраноміі БДПУ і адначасова праваслаўны святар. — Такое часта здараецца, і навукоўцы фіксуюць і заўважаюць падобныя з'явы. На тое яны і навукоўцы».

Выкід, зафіксаваны запушчаным у лютым апаратам SDO (Solar Dynamics Observatory), быў не самым вялікім з магчымых, але, тым не менш, яго наступствы будуць выразна заўважныя на Зямлі 4 жніўня, калі плазма дасягне нашай планеты. Часціцы сонечнай плазмы сутыкнуцца з газамі, «сцякаючы» па лініях магнітнага поля Зямлі. Калі раніцай у сераду сонечныя патокі дасягнуць Зямлі, пачнецца магнітная бура.

«Яе адчуюць навуковыя прыборы і вельмі-вельмі чуллівыя людзі, — тлумачыць А.Шымбалёў. — Аднак для большасці гэта будуць звычайныя дні. Пытанне з магнітнымі бурамі вельмі спрэчнае. Частка навукоўцаў піша, што гэта адбіваецца на стане здароўя чалавека. Але як гэта праверыць? На стан здароўя чалавека ўплывае вялікая колькасць фактараў. Можа, чалавек расхваляваўся, бо паўгадзіны таму яго абразіў хтосьці на вуліцы. А ён будзе наракаць на магнітную буру».

Спецыялісты NASA адзначаюць, што ўспышка, незалежна ад таго, дойдзе яна да Зямлі ці не, можа служыць сігналам паступовага «абуджэння» Сонца. Апошні максімум актыўнасці яго прыпаў на 2001 год, а пасля зорка ўвайшла ў фазу мінімуму актыўнасці. Аднак беларускі астраном сцвярджае, што нічога страшнага не адбылося ў 2001-м, не адбудзецца і цяпер.

**Настасся Шамрэй**

**Геамагнітныя буры**

ўплываюць на многія вобласці дзейнасці чалавека, у тым ліку сістэмы сувязі, навігацыі касмічных караблёў. Яны выклікаюць узнікненне паверхневых зарадаў на трансфарматарах і трубаправодах і нават разбурэнне энергетычных сістэм. Паводле меркавання некаторых навукоўцаў, магнітныя буры таксама ўплываюць на здароўе і самаадчуванне людзей.

# Як ратавацца ад спёкі

### Медыкі раяць простыя сродкі.

— Піце зялёную гарбату,

— насіце лёгкую, светлую адзежу з натуральных тканін,

— хавайцеся ў цяні,

— зачыняйце вокны з сонечнага боку ралетамі і аканіцамі,

— ежце марожанае,

— менш карыстайцеся касметыкай.

У спякоту не варта піць піва і моцную каву. Першае выклікае абязводжванне, а другая — нагрузку на сасуды.

Не раяць дактары піць моцныя алкагольныя напоі, нават у кактэйлях. У спалучэнні са спякотай гэта можа выклікаць спыненне сэрца.

Пры тэмпературы вышэйшай ужо за 26 градусаў кожныя паўгадзіны трэба выпіваць шклянку вады.

Астудзіць паветра ў памяшканнях дапамогуць і ёмістасці з вадой. Карысна ў спякотныя дні пырскаць у памяшканні пульверызатарам, класці, пры магчымасці, на плечы мокрую хустку, прымаць халодны душ.

Пры пагаршэнні самаадчування варта раз на дзве гадзіны паляжаць на канапе — гэта дапаможа знізіць ціск у сасудах.

А што рабіць тым, хто ў такую спёку павінен шмат часу праводзіць за стырном?

Панізіць тэмпературу ў машыне можна некалькімі спосабамі. Самы просты — выкарыстоўваць шторкі для абароны ад сонца. Таксама варта часцей мыць машыну. Чым больш бруду на кузаве і шкле, тым горш ад іх адлюстроўваецца сонечнае святло і тым хутчэй машына награецца.

Не загарайце празмерна!

Празмерны загар сушыць скуру і паскарае працэс старэння. Бесперапыннае загаранне можа выклікаць рак.

Сонечная радыяцыя разбурае калагенавыя валокны, што памяншае эластычнасць скуры. Ультрафіялетавыя промні пранікаюць глыбей — у дэрму — і выклікаюць некантраляваныя змены ў эпідэрмісе, аслабляюць імунныя механізмы скуры. З'яўляюцца новыя радзімкі. У канцы гэтага спісу — меланома і іншыя наватворы.

Што да кандыцыянераў, то пацяпленне клімату робіць іх прыладамі першай неабходнасці.

**Алесь Пілецкі**

# «Калі Сідорскі [вылучыцца], мы яму дапаможам»

Лідэр грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў адказаў на пытанні чытачоў сайта «НН». Анлайн-канферэнцыю можна бачыць у відэафармаце на nn.by. Прапануем увазе чытачоў самыя цікавыя фрагменты.




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**—Ці збіраецеся Вы ўдзельнічаць у якасці кандыдата на «выбарах» прэзідэнта? Андрэйка**

—Буду ўдзельнічаць у выбарах, калі будуць выбары.

**—Можа, варта пасля ліквідацыі зарэгістраваць «Рух Наперад за межамі Беларусі»? Марцінкевіч**

—Усё так: улада «знішчожыла» ўстанову «Рух наперад», каб знішчыць кампанію «Гавары праўду». Папросту: судзіць і садзіць актывістаў кампаніі за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Таму мы распачалі меры ў чымсьці падобныя да прапанаваных вамі.

**—Як Вы ставіцеся да заклікаў сп.Пазняка байкатаваць прэзідэнцкія выбары? Padarozhny**

—Я не выключаю байкоту як аднаго з магчымых сцэнараў прэзідэнцкіх выбараў. Але гэты сцэнар для некага, не для мяне. Ён разлічаны на перамогу ў нейкім будучым — невядома якім. А я бачу магчымасць перамогі цяпер — і зраблю ўсё магчымае і немагчымае, каб яна адбылася. У адначассі сцэнар перамогі і сцэнар байкоту — несумяшчальныя.

**—Ці маеце прагноз, калі будуць выбары?**

—Выбары адбудуцца сёлета. Новы год, хутчэй за ўсё, пачнецца з дэвальвацыі беларускага рубля. Папулярнасці кіраўніку краіны такая непапулярная дзея не дадасць. Калі планаваць удзел у выбарах ад сёння, дык добра падрыхтавацца, канечне, немагчыма. Але мы пачалі падрыхтоўку да іх значна раней. З усяго, што мы прааналізавалі, сістэматызавалі і падрыхтавалі да дзеянняў, вынікае, што да нас могуць прыйсці мільёны выбарцаў.

**—Як Вы лічыце, ці можа Плошча паўплываць на ход падзей выбараў? Чуб**

—Плошча, як і байкот — адзін са сцэнараў прэзідэнцкіх выбараў. Усяго сцэнараў чатыры. Я называю кожны з іх (умоўна, для сябе) па іх апратцы. Гэта выбары, на якіх:

1. Усе ў чорным (або нібыта выбары, у якіх тое, хто за каго галасаваў, назаўсёды застанецца чорным, невядомым, бо не мае ніякага значэння: пераможца вызначаны загадзя).
2. Усе ў паласатым (або выбары з дамоўленасцю паміж Расіяй, Еўрасаюзам і ЗША пра кандыдата ад апазіцыі).
3. Усе ў белым (або байкот).
4. Усе ў сваім (або плошча).

Па першым сцэнары ўсе застаюцца пры сваіх інтарэсах: Лукашэнка пры прэзідэнцтве, лідэры апазіцыі пры лідэрстве ў апазіцыі.

Па другім сцэнары Лукашэнка не застаецца. Але рэалізаваць гэта сцэнар (ва ўсялякім разе на сённяшні дзень) наўрад ці магчыма: у адносінах да Беларусі паміж Расіяй, Еўрасаюзам і ЗША вельмі вялікая нестыкоўка. На гэта сённяшняя Расія яшчэ не гатовая. Здавалася б, вось-вось, але ўсё яшчэ не і не.

Трэці сцэнар — гэта перанос перамогі на нейкі (які немагчыма акрэсліць) тэрмін. Не выключана, што яшчэ на столькі ж гадоў, колькі ўжо рэжым існуе.

Паколькі тры названыя сцэнары або не падыходзяць, або наўрад ці магчымыя — застаецца чацвёрты.

**—Дапаможаце Сідорскаму сабраць 100 тысяч подпісаў для вылучэння ў прэзідэнты? Body art**

—Калі спадар Сідорскі выкажа намер вылучацца кандыдатам у прэзідэнты Беларусі і не знойдзе магчымасці сабраць для гэтага 100 000 подпісаў, мы яму дапаможам. Бо гэта будзе крок рызыкоўнага чалавека — нават пры падтрымцы Расіі. Можна сказаць: тым больш пры падтрымцы Расіі. І нават не рызыкоўны — адчайны крок. Няцяжка ўявіць, якую ён выкліча антырасейскую істэрыю — і кім стане ў такім выпадку сённяшні прэм'ер. Акажацца, што ён не толькі матку родную прадаў...

**—Якія ў Вас стасункі з Казуліным, з Мілінкевічам? Саня**

—З Казуліным ў нас сяброўскія. З Аляксандрам Мілінкевічам такімі адносінамі, на жаль, не магу пахваліцца. Але ўсё яшчэ можа быць...

**—Ці гатовыя Вы ісці на кампраміс па вылучэнні адзінага кандыдата? І ці гатовыя Вы на выбарах ісці да канца, то бок альбо да вашага поўнага знішчэння, альбо да самай улады? Ваш выбар**

—Я вагаюся, пакуль прымаю рашэнне. Быць ці не быць. Прыняўшы, не вагаюся. Наўпрост пытанне — наўпрост адказ: гатовы на ўсё. Як ісці на кампраміс (з кожным і з усімі), гэтак і ісці да канца. Да поўнага, як вы кажаце, знішчэння, альбо да самай улады.

**—Што будзе з усімі «говоріправдовцамі», якія збеглі са сваіх партыяў да Вас пасля таго, як пройдуць прэзідэнцкія выбары? Бабруйчанка**

—Пасля таго, як пройдуць прэзідэнцкія выбары, трэба будзе з м я н я ц ь Беларусь. Занятак — для ўсіх, працы хопіць і партыйным, і беспартыйным. Так што ні з кім нічога кепскага не будзе.

**—Ці маеце Вы ўласную праграму, уласнае бачанне развіцця краіны? daroha**

—Праграму развіцця краіны мы, безумоўна, маем. І прадставім яе на абмеркаванне, калі пойдзем на выбары. Акцэнты зробленыя на эканамічныя, а не на палітычныя праблемы.

**—Адкажыце, калі ласка, чаму Вы праводзіце расейскамоўную кампанію? Беларускамоўная**

—Няўжо вы думаеце, што мне, беларускаму паэту, тое, пра што вы пытаецеся, баліць менш, чым вам?.. Беларусь і цяпер расейскамоўная краіна. Так што ў гэтым накірунку я наўрад ці змагу «зрабіць асабістую перамогу». Хутчэй — у зваротным.

**—А калі пасля выбараў «новы» прэзідэнт прапануе Вам міністэрскую пасаду (напраклад, мін. культуры), Вы згадзіцеся ці не? Awa**

—Мяркую, я магу працаваць толькі ці паэтам пры паэце, ці прэзідэнтам пры прэзідэнце. Сам пры сабе. Чаму так мяркую?.. Спрабаваў працаваць пры прэзідэнце паэтам — не выйшла.

**—Ці збіраецеся Вы сустрэцца з прэзідэнтам Расіі Мядзведзевым, якія б пытанні там падымалі? Нікаля**

—Калі такая сустрэча адбудзецца і мяне на яе запросяць, дык штонебудзь я там падыму... Як за савецкім часам жартавалі: апроч фужэра...

**—Які б Вы паставілі помнік Лукашэнку?**

—Бадай што, ён — у лыжах на кані, а конь — на веласіпедзе... А ўвогуле помнік Лукашэнку некалі можа стаяць. Нармальны. Калі ён зразумее, што для гэтага ў час трэба сысці. Каб не замінаць будучыні тых, хто можна паставіць яму нармальны помнік.

**—Ці не адгаворваў Казулін Вас пайсці на Усебеларускі сход? Даніла**

—Казулін мяне адгаворваў. Але некалі я гэтаксама адгаворваў Казуліна.

**—Творчасць і палітыка — рэчы несумяшчальныя, як Вы, творчая асоба, вырашылі займацца палітычнымі справамі? Tacciana**

—Сапраўдны паэт, Таццяна, гэта менавіта той, хто сумяшчае несумяшчальнае. І можа быць і птушкай, і жабай адначасова...

**—Спадар Някляеў, ці гатовыя Вы працаваць з Яраславам Раманчуком на гэтых выбарах? АГПэшнік**

—Так, паміж намі ёсць дамоўленасць пра супрацоўніцтва. Я на сваіх сустрэчах распавядаю пра ягоную перадвыбарную праграму, ён — пра мэты кампаніі «Гавары праўду». І гэта ёсць прыклад таго, як павінны былі б паводзіцца ў гэты найадказны час усе грамадскія арганізацыі, палітычныя партыі ды іх лідэры.

**—Як Вы бачыце стратэгію для пабудовы дэмакратычнага грамадства ў Беларусі? Tatiana Обр**

—Фармаванне парламенцка-прэзідэнцкай рэспублікі.

Асноўныя задачы:
- выбарнасць мясцовай улады;
- выбарнасць суддзяў;
- увядзенне змешанай сістэмы выбараў.

**—Як Вы ставіцеся да КХП-БНФ, БХД, Маладога Фронту?**

—Да ўсіх, хто супрацьстаіць рэжыму, маё стаўленне паважлівае. Асабліва да маладых. Яны маглі быць на іншым баку — і хто, і за што іх папракнуў бы? За тое, што менавіта мы, старэйшыя, стварылі варункі, у якіх ім трэба выбіраць, на якім баку стаяць? За тое, што нехта з іх хоча не змагацца, а зарабляць грошы, рабіць кар'еру — і тым жыць? Як большасць іх равеснікаў, якія не ў БХД ці Маладым фронце, а ў БРСМ.

**—Калі Вы станеце прэзідэнтам нашай краіны, якімі будуць адносіны з Еўрасаюзам? Павал**

—Некалі Беларусь абавязкова ўступіць у Еўрасаюз. І як гэта сёння ні здасца некаму дзіўным — з дапамогай Расіі, якая знойдзе ў тым сваю выгаду. Бо ў трубе (нафтавай ці газавай) Расіі труба. Ёй трэба будзе скідваць з сябе «сыравіннае пракляцце», паварочваць эканоміку ў бок сучасных тэхналогій, што немагчыма без стыкоўкі — праз Беларусь — з Еўрасаюзам.

**—Чаму Вас называюць прарасійскім кандыдатам? Вас гэта не абражае? Ігар**

—Многім чамусьці надта хочацца, каб я Расію ненавідзеў. Яна такая, яна гэткая, праваслаўная, імперская, з ёй мы шчасця не мелі. А з кім мы мелі шчасце?..

Давайце паспрабуем займецца яго самі з сабой, не вінавацячы ў адсутнасці яго суседзяў.

Я люблю Расію. Там, на Волзе, з першым крыкам удыхнуўшы прыволжскі стэпавы вецер, нарадзіўся мой бацька. Гэта — любоў дарадзіннай памяці, любоў душы, сэрца. Давайце не загадваць нашым сэрцам не любіць — і ўсё ў нас будзе добра. Па любові, якая нават вышэй за праўду.

**Уладзімір Някляеў**

нарадзіўся 9 ліпеня 1946 у Смаргоні. Бацька — Някляеў Пракофій (Пракоп) — расеец, маці — Магер Настасся, беларуска. Пражыў дзіцячыя гады ў Крэве. Вучыўся ў Мінскім элетратэхнікуме сувязі (1962 — 1966), на аддзяленні паэзіі Літаратурнага інстытута (1971, Масква), скончыў філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута (1973).

Працаваў сувязістам на Поўначы, у Сібіры, на Далёкім Усходзе, радыёмеханікам у мінскім тэлевізійным атэлье. Супрацоўнічаў у газеце «Знамя юности», рэдагаваў бюлетэнь «Тэатральны Мінск», быў старшым рэдактарам галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычных праграм Беларускага тэлебачання, галоўным рэдактарам часопіса «Крыніца», штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». З 1998 па 2001 — старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Ад лютага 2010 — лідэр грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду!»

# Частка IX. Полацк як Троя

Піша **Алег Дзярновіч.**

Працяг. Пачатак у №26, 28, 30, 39, 47 за 2009 год, №7, 22, 27 за 2010 год.

Полацк добра вядомы ў ісландскіх сагах і помніках старажытнаскандынаўскага пісьменства як Palteskja. Гэтая назва можа адлюстроўваць старажытную форму, зафіксаваную ў рускіх крыніцах: *Полтескъ**. І вось вакол гэтай Палтэск'і ў скандынаўскіх паданнях разварочваюцца неверагодныя падзеі.

## Атыла і Тыдрэк Бернскі штурмуюць Полацк

Самыя архаічныя звесткі, у трансфармаваным выглядзе, захоўвае «*Сага пра Тыдрэка Бернскага*». Вандраванні гэтага легендарнага героя праз эпас розных германскіх народаў здольныя захапіць розум. Гэтым разам Тыдрэк знаходзіўся ў войску гунскага правадыра Атылы, які:

«*Ідзе... з гэтым войскам на Русь і на Польшчу і паліць бургі і замкі паўсюль, дзе ён праходзіць. І прыйшоў конунг Атыла з усім сваім войскам да горада, які завецца Палтэск'я. Горад гэты так умацаваны, што яны не ведаюць, як яго ўзяць. Быў там магутны каменны мур, вялікія вежы і шырокія ды глыбокія равы, а ў горадзе было вялікае войска для яго абароны...*»

Калі стала ясна, што Пальтэск'ю няма як узяць з налёту, Атыла загадаў паставіць намёты ды падзяліў войска на тры часткі: «*пад сваёй харугвай ён ставіць 10 тысячаў, а іншых 10 тысячаў рыцараў размяшчае ў іншым стане, а над імі начальнікам Тыдрэка Бернскага, а за тым аддзелам хадзіла ўслед багата валацугаў, а ў трэцім стане ставіць ён 10 тысяч рыцараў пад кіраўніцтвам маркграфа Радынгейра, і мелася ў яго вялікая група блазнаў*».

Усе тры начальнікі ставяць намёты насупраць горада, «*і шмат дзён змагаюцца яны з гараджанамі, здзяйсняючы шмат вялікіх учынкаў, і кожны бок церпіць ад іншага вялікія страты*». Аблога цягнулася тры месяцы. Урэшце Тыдрэк прапанаваў Атылу падзяліць сілы — некаму застацца пад Палтэск'яй, а іншым рушыць далей на Русь. Атылу ж здавалася, што «*гарадскі мур значна парушаны, бо дзень і ноч дзейнічалі сценабітныя машыны, якія рухалі не менш за трыста чалавек, і было іх багата ў кожным аддзеле*». І адказваў конунг Атыла конунгу Тыдрэку: «*Так шмат намаганняў зрабіў я на тое, каб узяць гэты горад, што не жадаю з'ехаць адсюль перш, чым мой сцяг будзе пастаўлены на бастыёнах*».

Урэшце Тыдрэк са сваім аддзелам сышоў да Смаланда (Смаленска), а праз тры дні Атыла «*робіць такі моцны штурм з ваеннымі машынамі і самастрэламі, што ім удаецца ўзяць горад. І ў гэты дзень гуны ўвайшлі ў горад з усім сваім войскам, перабілі шмат людзей ды ўзялі незлічоную здабычу, амаль увесь горад зраўнялі з зямлёй. У той час былі здзейснены ўчынкі, якія яшчэ можа бачыць кожны, хто прыходзіць у гэты горад*».

Вядома, апісанні Полацка, ды яшчэ ў Атылавы часы, у V ст., выглядаюць нерэальна. Сага кажа нам хутчэй пра вобраз Полацка ў германскай міфалогіі і пра тое значэнне, якое гораду надавалі скандынавы ў познім Сярэднявеччы. Але тут трэба крыху разабрацца з самімі персанажамі выправы на Палтэск'ю.

Тыдрэка яшчэ іначай называлі Дытрыхам — гэта герой германскага цыкла эпічных паданняў, найстаражытнейшая частка якіх узнікла ў эпоху *Вялікага перасялення народаў* (IV—VII ст.). У аснове сюжэта пра Дытрыха Бернскага ляжыць паданне аб сварках знакамітага караля остготаў Тэадорыха (475—526 гг.) з правадыром германскіх наймітаў Адаакрам (быў забіты падчас піру Тэадорыхам у 493 г.). Але ў працэсе складання эпасу імя Адаакра замянілася на імя остгоцкага караля IV ст. Германарыха. Яго дзяржава, праўдападобна, кантралявала і паўднёва-заходнія землі сучаснай Беларусі, але была змецена гунамі.

Каб далей не блукаць сярод імёнаў гістарычных і эпічных персанажаў варварскай Еўропы, варта адцеміць толькі адну асаблівасць, важную для нас, — прысутнасць гунскага сюжэта. Тэадорых-Дытрых, вораг Германарыха, жыве ў выгнанні пры двары Атылы, паданне пра Дытрыха ўваходзіць у эпічнае кола легендаў пра Атылу. Апошні — важная фігура для вуснай германскай традыцыі, у якой памяць пра правадыра гунаў перадавалася з пакалення ў пакаленне. Ён распачынае лік германскіх валадароў. У сярэдзіне V ст. гунскі правадыр здолеў аб'яднаць пад сваёй уладай варварскія плямёны ад Рэйна да Паўночнага Прычарнамор'я. У адрозненне ад царкоўнай традыцыі, у вусных паданнях гэты грозны гун характарызуецца як слаўны ўладар, гасцінны і справядлівы з васаламі.

Паданні пра Дытрыха ўтрымліваюць архаічныя сюжэты індаеўрапейскай міфалогіі, у тым ліку матыў змагання бацькі з сынам, які мае старажытнагрэцкія (Эдып і Лай) ды персідскія (Рустэм і Зараб) паралелі. У сваіх пазнейшых формах паданні пра Дытрыха перасякаюцца з класічным германскім цыклам «*Нібелунгаў*».

Паданні пра Дытрыха Бернскага ўпершыню пачалі запісваць, верагодна, у XI ст. на поўдні Нямеччыны, у Падунайскіх абласцях. З Саксоніі яны перайшлі ў скандынаўскую літаратуру, а ў першай палове XIII ст. у Нарвегіі версіі падання былі аб'яднаныя і запісаная такім чынам «*Сага пра Тыдрэка*». У Германіі паданні пра Дытрыха перастаюць распавядаць у эпоху Трыццацігадовай вайны (1618—1648 гг.), але ў Скандынавіі (Даніі і Нарвегіі) пра Тыдрэка яшчэ працягвалі спяваць гераічныя балады, а на вулканічных базальтах Фарэрскіх выспаў у Паўночнай Атлантыцы яны бытавалі яшчэ ў канцы XIX ст. І паўсюль у скандынаўскім свеце распавядалася пра штурм Полацка.

Безумоўна, гунская аблога Полацка — гэта міфалагізаваны сюжэт, накладанне падзей X ст. на эпоху Вялікага перасялення народаў. Як рэальны Полацк робіцца міфічным цэнтрам прыцягнення старажытнаскандынаўскай літаратуры, добра паказвае аналіз наступнага тэксту, аўтар якога нават вядомы.



Атыла. Фрагмент фрэскі Эжэна Дэлакруа (каля 1840 г.).

## Саксон Граматык і ягоны Ілліён

Гаворка пойдзе пра лацінамоўную «*Гісторыю данаў*» («*Gesta Danorum*») дацкага храніста другой паловы XII ст., вядомага як Саксон Граматык (памёр пасля 1208 г.). Мянушка «Граматык» яму была дадзеная ў XIV ст. у знак прызнання яго стылістычнага майстэрства — лаціністы адзначаюць несумненны мастацкі і моўны талент аўтара «*Гісторыі данаў*». Хутчэй за ўсё, ён атрымаў адукацыю па-за межамі Даніі, магчыма ў Францыі, дзе квітнелі традыцыі лацінскай адукацыі.

Яго манументальны твор «*Гісторыя данаў*» складаецца з 16 кніг, у якіх выкладаецца гісторыя дацкіх каралёў ад легендарных часоў да 1187 г. Крыніцамі інфармацыі і натхнення для Саксона былі сярэднявечныя хронікі, паганскія скандынаўскія легенды, ісландскія сагі, дацкія песні і, што важна, антычная літаратура. Саксон Граматык стварыў выразныя карціны сярэднявечнага жыцця, а таксама яркія замалёўкі асобных чалавечых лёсаў. Для наступных пакаленняў ён захаваў многія паўночныя народныя легенды і эпічныя паданні, якія распаўсюджваліся ў вуснай форме.



Саксон Граматык. Гравюра 1898 г.

Хроніка Саксона Граматыка аказалася вельмі важнай і для гісторыі сусветнай літаратуры. Як у нарвежскай сазе пра Тыдрэка Бернскага мы сустракаем прататыпа Іллі Мурамца — Ілія з Русі, так і Саксон Граматык данёс да адукаванай публікі легенду пра Гамлета, прынца Ютландскага, які помсціць за хцівае забойства бацькі. Паданне пра Гамлета ў 1600—1601 гг. перапрацаваў Уільям Шэкспір. Праўда, Гамлет Шэкспіра — меланхолік і першы літаратурны герой, які рэфлексуе. Такая трактоўка вобраза не супадае з бачаннем Саксона Граматыка: «па-майстэрску абараніўшы сябе, адважна адпомсціўшы за бацьку, ён прымушае нас дзівіцца, адвагай ён слаўнейшы ці мудрасцю».

Сабраўшы паўночнаеўрапейскія паданні пра войны данаў, аўтар іх гісторыі асаблівую ўвагу надаў аднаму гораду на Русі — Палтэск'і. Вось як, паводле Саксона Граматыка, выглядала выправа легендарнага караля Фрода I пад гэты горад: «*Пераканаўшыся, што сілай горада не перамагчы, ён пайшоў на хітрасць. Пры невялікай колькасці сведкаў адправіўся ў таемнае месца і загадаў паўсюль абвясціць, што ён памёр, каб тым самым усыпіць ворага. Дзеля пераканаўчасці быў здзейснены абрад пахавання і насыпаны пахавальны курган. Да таго ж воі, свядома паказваючы смутак, прайшлі ў працэсіі за нібыта памерлым правадыром. Пачуўшы пра гэта, кароль горада Веспасій, які ўжо амаль атрымаў перамогу, так нядбайна паставіўся да абароны, што, даўшы магчымасць ворагам ўварвацца ў горад, быў забіты сярод гульняў і забаваў*».

Аналагічны сюжэт сустракаецца ў ісландскай «Сазе пра Гаральда Суворага», але там дзеянні адбываюцца ў Сіцыліі. Фактычна, гэта «вандроўны сюжэт», запазычаны скандынавамі з антычнай грэка-рымскай культуры. У апісанні Саксонам Граматыкам узяцця Палтэск'і мы бачым паралелі з аблогай старажытнай Троі — Іліёна, якія сталі галоўным сюжэтам старажытнагрэцкай эпічнай паэмы «Іліяда», аўтарства якой прыпісваецца Гамеру (VIII ст. да н.э.). Асновай для «Іліяды» паслужылі грэцкія паданні пра подзвігі герояў. Пасля доўгай і беспаспяховай аблогі Троі грэкі таксама пайшлі на хітрасць, збудаваўшы, паводле парады Адысея, драўлянага каня, у якім схаваліся лепшыя воіны ахейцаў. Траянцы зацягнулі яго ў горад, а ўначы грэкі перабілі гарнізон Троі. Так і Палтэск'ю, гэтую паўночную Трою, можна было ўзяць толькі з дапамогай таемнай, падступнай задумы.

У дэталях апісання Палтэск'і ў «Сазе пра Тыдрэка Бернскага» і ў вобразе горада, створанага Саксонам Граматыкам, адчуваецца пэўны гераічны канон. Але, як звяртае нашу ўвагу маскоўская скандынавістка Тацяна Джаксан, гэты стэрэатып ніяк не стасуецца з апісаннямі старажытнарускага горада: «Для старажытнарускіх гарадоў дадзенае апісанне ўнікальнае!» З 12-ці апісаных у сагах і іншых скандынаўскіх помніках гарадоў Русі толькі Полацк вылучаецца сваімі ўмацаваннямі. Сістэмай абароны і значнасцю ў рэгіёне Полацк IX—X стст. прыцягваў такую ўвагу паўночных вандроўнікаў, якія набліжаліся да яго па Дзвіне, што скандынаўскія скальды былі гатовыя ствараць фантастычны вобраз гэтага няблізкага і адначасова дасягальнага горада. Апроч таго, спрабуючы вывучаць ранніюю палітычную гісторыю Полацка, мы намацваем зусім неверагодныя сюжэты, якія звязваюць гэты горад з гісторыяй культуры і літаратуры Еўропы.

Якія рэальныя гістарычныя падзеі можна суаднесці са звесткамі саг і пра ўзвышэнне ў Полацку скандынаўскіх наймітаў чытайце ў працягу «Гісторыі Беларусі».

---

* Mikkola 1907, 281; Брим 1931, 218; Джаксон Т. Н. *Austr í Görđum: древнерусские топонимы в древнескандинавских источниках*. М., 2001. С. 123—125.

# Віртуальная экскурсія па Купалаўскім тэатры будучыні

Будынак тэатра імя Янкі Купалы апусцее. Рэканструкцыя пачнецца ў верасні 2010-га, працягнецца два гады і завершыцца ў 2012-м. Рэканструкцыя — а яна першая ад 1957 года — прадугледжвае пераробку як вонкавага выгляду тэатра, так і яго інтэр'ераў. Аўтары праекта, з аднаго боку, хочуць аднавіць першапачатковы выгляд, а з іншага — прыўнесці найноўшыя напрацоўкі ў тэхнічную «падшыўку».

Пры дапамозе кампутарнай графікі запрашаем вас зазірнуць усярэдзіну Купалаўскага тэатра ўзору 2012-га, зрабіць агледзіны будучых інтэр'ераў.

Найперш гэта датычыць фае: тут заменяць падлогу, адрэстаўруюць калоны і зробяць каваныя парэнчы на сходах. Усё будзе, як у год заснавання — 1890. Апроч хіба плазмавых экранаў, якія з'явяцца на сценах.

Гардэроб перанясуць у сутарэнне. Спусціўшыся ў сутарэнне, вы не адчуеце задухі — упершыню ў Беларусі ўвесь тэатр будзе абсталяваны сістэмаю кандыцыянавання. Зазнае рэканструкцыю і другі паверх. Тут зробяць утульную гасцёўню. І зноў дыктаваць умовы будзе мода XIX стагоддзя.

Найбольшыя змены чакаюць залу. У ёй будуць аднаўленыя, цяперашняй мовай кажучы, VIP-кабінкі. З дапамогай кампутарнага праектавання месцы будуць разлічаныя гэткім парадкам, каб з самага далёкага шэрагу балкона можна было ўбачыць сцэну. Фатэлі заменяць на зручныя крэслы, а колькасць глядацкіх месцаў зменшыцца з 523 да чатырох соцень. Усю залу абсталююць раздзяляльнай сістэмай гуку а-ля долбі, як у сучасным кінатэатры.

Адновяць гарызантальную заслону. Па ўсёй сцэне зробяць люкі, каб акцёры маглі з'яўляцца на сцэне падчас п'есы. Тэатр прыдбае мабільную пляцоўку, якая дасць магчымасць круціць сцэну. І ў дадатак — экраны, што паказваюць насычаны відэашэраг.

І апошняе старое ноу-хау: крэслы прыбіраюць, падлогу ў партэры падымаюць і сцэна ператвараецца ў залу для баляў ды іншых урачыстасцяў. Гэтак было ў XIX стагоддзі, калі губернскі Мінск не мог дазволіць сабе мець аднамэтавую пляцоўку, гэтак будзе і ў XXI ст., калі сталічны Мінск ашчаджае кожны лапік зямлі.

У дадатак, тэатр зменіць фірмовы стыль. Новы лагатып з'явіцца на квітках, запрашальніках, афішках. З яго знікне аблічча Янкі Купалы.

Мастацкі кіраўнік тэатра Мікалай Пінігін кажа, што адсутнасць паэта зусім не азначае, што тэатр перастае быць Купалаўскім, проста тут важна падкрэсліць, што «ў нас дзяржаўны тэатр і што ён мае свой будынак».

**Павал Касцюкевіч**

**200 000 000 000 рублёў**

будзе каштаваць рэканструкцыя тэатра. Падчас рэканструкцыі трупа будзе выступаць на сцэнах КЗ «Мінск», Палаца прафсаюзаў, Дома афіцэраў.



**Выгляд тэатра пасля рэстаўрацыі. Праектны малюнак.**



**Гардэроб пераедзе ў сутарэнне.**



**Зала стане мультыфункцыянальнай.**

**Цяперашні лагатып.**

**Гэтак будзе выглядаць фірмовы стыль, або новы лагатып Купалаўскага тэатра.**

## З наступнага сезона білеты ў Купалаўскі падаражэюць удвая

Некаторыя акцёры тэатра атрымліваюць у месяц 900 тыс. рублёў. Пра гэта паведаміла вядомая акторка Святлана Зелянкоўская. «Я ведаю такія выпадкі, калі муж і жонка абодва працуюць толькі ў тэатры, то яны, сплаціўшы крэдыт за кватэру, пазычаюць на жэтон», — кажа Зелянкоўская.

Зелянкоўскую падтрымлівае малады актор Раман Падаляка.

«Гэта як плата за хобі, а не заробак, — кажа Падаляка. — Міністэрству культуры трэба падумаць, каб заробак набліжаўся хаця б да двух мільёнаў».

Чыноўнікі з Мінкультуры тлумачаць, што не толькі акцёры, але і музейнікі, бібліятэкары атрымліваюць гэтаксама мала.

«Заробак будзе залежыць ад эканомікі, — кажа першы намеснік міністра культуры Уладзімір Карачэўскі. — Мы ўсё ж датацыйная сфера».

Ці можна павысіць самаакупнасць трупы, напрыклад, за кошт падвышэння цэнаў на білеты, якія цяпер каштуюць, як у кіно?

«Каб павышаць цэны на квіткі, трэба павялічваць і заробкі, — кажа гендырэктар тэатра Павал Палякоў. — Давайце зробім квіткі за 100 тысяч, і што, у зале будзе сядзець 30 чалавек? Мы доўга думалі над гэтым пытаннем і пакуль што вырашылі з наступнага сезона падняць цэны толькі ўдвая».

**ЛК**



## Пінігін паставіць «Пінскую шляхту» па-польску

Хоць «і расейцы, і палякі нам да дупы, нам да сракі».

У варшаўскім тэатры «Рампа» пры канцы кастрычніка Купалаўскі тэатр пакажа класічную п'есу Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта». Для польскага гледача п'еса будзе агучана па-польску. Пра гэта паведаміў мастацкі кіраўнік тэатра Мікалай Пінігін.

Ці не ганебна для Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы выступаць у тэатры «Рампа», а не на знакамітых сцэнах «Тэатра Нарадовага» і Ateneum'а?

«У нас карона не зваліцца, — кажа Пінігін. — Гэта ж нашы першыя крокі на міжнароднай арэне, і, думаю, мы годна прадставім наш спектакль».

Прэм'ера класічнага фарс-вадэвіля «Пінская шляхта» ў пастаноўцы Пінігіна адбылася ў Купалаўскім у 2008 г. Ролю станавога прыстава Кручкова ў ім грае вядомы актор Віктар Манаеў. Рэжысёр зрабіў п'есу вельмі незалежніцкаю, калі пад заслону засцянковая шляхта з гонарам падымае свае радавыя гербы, а падчас п'есы гучаць прыпеўкі: «І расейцы, і палякі нам да дупы, нам да сракі».

**ЛК**

## Бураўкін у спёку не піша, а Дубавец складае гіпертэкст

Над чым айчынныя літаратары працуюць летам?

• **Генадзь Бураўкін:** Ні над чым не працую. Спякоту такую пераношу цяжка. Таму аддаюся чытанню. Перачытваю Якуба Коласа, Янку Купалу, Івана Буніна... Чытаю прэсу.

• **Адам Глобус:** У нас жа не сельскагаспадарчы цыкл у літаратуры. Пісьменнікі заўжды працуюць. Я гавару пра сапраўдных пісьменнікаў, а не пра халтуршчыкаў. Скептычна стаўлюся да перыядычных выданняў. Таму працую над блогам. Пішу цыкл «Суч*а*снікі» (не с*у*часнікі), якія мне дарагія. Анатоль Сыс, Люда Русава...

• **Віталь Рыжкоў:** Дапрацоўваю сваю першую кнігу, якая, спадзяюся, выйдзе да канца гэтага года. Яна будзе мець назву «Дзверы, замкнёныя на ключы». Рэдагую найперш пераклады і ўласныя тэксты. У кнігу ўвойдуць пераклады з Уістана Х'ю Одэна, Сяргея Жадана, Тэйлара Мэлі, Майкла Сэлінджэра, Георгія Нахуцрышвілі і Рышарда Крыніцкага.

• **Сяргей Дубавец:** Складаю гіпертэкст «М. Гісторыя аднаго цуду» пра Беларускую Майстроўню (1980-1984). Фрагменты выходзяць штотыдзень на радыё «Свабода». Вынік узяць у рукі і прэзентаваць мяркую на Каляды.

• **Андрэй Курэйчык:** Працую над сцэнарам камедыі для прадзюсера Сяргея Сяльянава і расійскай кінакампаніі СТВ (выпусціла фільмы «Мангол», «Брат», «Брат-2», «Асаблівасці нацыянальнага палявання»). Таксама пішу п'есу пад назвай «Мінск, я люблю цябе» для цікавага праекта аднаго з мінскіх тэатраў.

• **Альгерд Бахарэвіч:** Працую над «Малой медычнай энцыклапедыяй Бахарэвіча». Артыкулы энцыклапедыі публікуюцца кожную пятніцу на сайце радыё «Свабода». На сёння іх ужо дваццаць сем. У выніку будзе зборнік эсэ на літаратурна-медычныя тэмы. Апрача таго, перакладаю адзін тоўсты сучасны нямецкі раман, сюжэтна таксама звязаны з медыцынай.

• **Вера Бурлак:** Адпачываю. Некалькі вершаў напісала.

• **Уладзімір Арлоў:** Першыя два летнія месяцы працаваў над працягам кнігі «Адкуль наш род». Цяпер кніга будзе ў тры разы большая па аб'ёме, чым першае выданне. Яна завяршаецца падзеямі, якія прывялі да незалежнасці Беларусі. Пісаліся вершы, рабіліся накіды да рамана, які мару напісаць.

**Апытваў Сяргей Макарэвіч**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Новыя апавяданні пра Леніна

**Клім Клімч-Клімевіч.**

## Ленін і снайперы

У суботні пахмурна-сонечны дзень Ленін гуляў па горадзе, аж пакуль не спыніўся ля кіёска з гароднінай, які раскінуў на прылаўку памідоры і агуркі.

— Колькі грошай? — спытаў ён у прадавачкі ўзросту позняга Рэнесансу і паказаў на банан.

— А навошта вам ён? — запыталася ў адказ жанчына, паправіўшы на галаве форменную пілотку фасону ранняга Адраджэння.

— Не мне, — Ленін паклаў моцную руку на плячо дочы. — Дочы. Хочаш, доча, банан?

— Доча хоча пі-пі, — дзіця ўжо даўно пераступала з нагі на нагу.

— Дзе ў вас тут можна пі-пі? — Ленін працягнуў паперку купюрай у пяць тысячаў дагары.

— Пойдзем, дзяўчынка, — прадавачка шмякнула на прылавак шыльдачку «Пераўлік бананаў» і павяла дочу Леніна да найбліжэйшай біяпрыбіральні.

— А снайперы гадзінамі сядзяць у засадзе і не могуць сабе дазволіць пі-пі, — паведаміў Ленін дзецям у чарзе.

— Ёсць такая прафесія — гадзінамі сядзець без пі-пі, — адказаў нехта яму.

— Дзеці, — звярнуўся Ленін да дзяцей Горадаўтваральнага раёна сталіцы, — сярод дзяцей вашай краіны ёсць такія дзеці, якія ўвесь час сваволяць. Прычым асабліва яны любяць сваволіць побач з адміністрацыяй Леніна. Не даўней як нядаўна яны нават вывесілі ў будынку насупраць адміністрацыі сцягі раздражняльных для мяне колераў.

Чарга асуджальна загула.

— Я вам шчыра скажу, — спыніў жэстам рукі гнеў гараджанаў Ленін. — Пяты паверх маёй адміністрацыі займае падраздзяленне снайпераў, якія кругласутачна дзяжураць на сваіх пастах. Аглядаюць наваколле, выглядаюць падазроных дзяцей. Мною ім дадзеныя самыя жорсткія ўказанні: як што — адразу страляць на паражэнне. Бо вас у Леніна шмат, а Ленін у вас адзін.

Чарга ўхвальна загула.

— Дзеці, сказаў я тады снайперам, — Ленін скупа ўсміхнуўся, — не трэба па іх страляць, яны ж дзеці. Ну што вось гэтыя анучы. Мы ведаем, хто і колькі заплаціў за тое, каб іх вывесіць насупраць будынка адміністрацыі Леніна. Я — чалавек найглыбейшай дэмакратычнай загартоўкі. Я бачыў жывога Яўлінскага. Ён бы так не зрабіў. Хай іх, сказаў я снайперам. Прыйшла, доча? Як пі-пі? Дзякуй вам, жанчына. Хай іх, сказаў я снайперам. Злавіце іх, накруціце вушы і здыміце штаны. А бацькі дзяцей няхай за іх заплацяць штраф. Калі не здолелі. І грошы гэтыя, я пры ўсіх вас адкрыта скажу, за што мяне не любяць, мы аддамо гэтым бедным снайперам. Што не могуць сабе дазволіць пі-пі, калі вакол адмарожаныя шакалы з анучамі. Здароўя вам, дзеці.

Чарга пайшла папраўляць здароўе, што рэзка пахіснулася пасля такой размовы, а Ленін, яго доча і снайперы выправіліся ў наступны раён сталіцы — Лёсавызначальны.

## Ленін і верталёт

Ленін аблятаў на верталёце. Ён глядзеў у адкрыты ілюмінатар і курыў. Увогуле Ленін не курыў. Але ў адкрыты ілюмінатар ён курыў і ў фортку ён таксама курыў. Ленін выпускаў у позневясновае неба струменьчыкі айчыннага непрыемнага дыму і думаў. «Што за брыдота гэты тытунь гродзенскай фабрыкі, — Ленін сплюнуў тытунёвыя крыхі. — Палітыка пратэкцыянізму часам мае і адваротны бок. Возьмем, да прыкладу, вось гэты тытунь гродзенскай фабрыкі і сапраўдны вірджынскі тытунь, вырашчаны ў Вірджыніі. Гэта ж розніца. Здавалася б, зямля адна — а тытунь розны».

Ленін выкінуў недапалак у ілюмінатар. Далёка ўнізе рудзелі засеяныя раннімі яравымі збожжавымі прыгожыя палі, на прыгожай зямлі працавалі прыгожыя людзі і прыгожыя трактары вытворчасці МТЗ. «Прыгожа, — Ленін любіў усё прыгожае. — А якіх-небудзь пятнаццаць гадоў таму на гэтых непрыгожых палях непрыгожай зямлі працавалі непрыгожыя людзі. І мне цяпер аддаць усю гэтую прыгажосць, да якой я столькі прыклаў, нейкім пацаннікавым? Гэтую прыгожую зямлю — нейкім пацаннікавым? Масква на яго паставіла, кажуць. Недалёкія людзі так кажуць. А маскоўскі Ленін усё гэта разумее. Ён, як і я, разбіраецца ў сапраўднай прыгажосці. Варта б з ім пасядзець вечарок, пагаманіць пра прыгажосць. Што ёсць такога паміж намі ненатуральнага, што два прыгожыя Леніны не могуць дамовіцца? Хоць бы і на касабокай прагматычнай аснове?»

Ленін зноў закурыў і прымружыў вочы — ці то ад дыму, што ў іх трапіў, ці то па шматгадовай звычцы, выпрацаванай гадамі. Лопасці верталёта круціліся.

## Ленін і дзеці

Пасля вашай радзімы больш за ўсё на свеце Ленін любіў дзяцей. Прычым ён любіў іх не па-дзіцячаму і не як звычайныя людзі, а ўсім сваім ленінскім сэрцам. Людзі так не маглі, бо ў іх не было ленінскага сэрца. Ленін часта любіў збіраць вакол сябе дзяцей і гутарыў з імі гадзінамі, а то і днямі. Як і гэтым разам, калі ішоў трэці дзень зносінаў Леніна з дзецьмі.

— Дзеці, — Ленін абвёў вачыма дзяцей. — Вы, напэўна, хочаце спытаць мяне, навошта да вас прыязджаў таварыш Пхын Дхын Чхын?

— Хочам! — запляскалі дзеці.

— Гэта вельмі добрае пытанне, дзеці, — вочы Леніна наліліся дабрынёй. — З краінай таварыша Пхын Дхын Чхына вашу краіну звязвае даўняе слаўнае мінулае, як блізкае, калі вы разам паставілі на калені Злучаную Піндастанію, так і не, што вядзе ў тыя стагоддзі, калі продкі таварыша Пхын Дхын Чхына разам з Каліноўскім ого-го як!..

Ленін не стаў тлумачыць, што такое «ого-го як», бо ў кожным падручніку і ў кожнай навуковай манаграфіі вашай краіны пад рэдакцыяй Леніна падрабязна і з малюнкамі расказвалася пра гэтае самае «ого-го як».

— Дык вось, — працягнуў Ленін, — таварыш Пхын Дхын Чхын прыязджаў да вас з просьбай. Ён ведае, што ў вашай краіне на кожнага яе грамадзяніна прыпадае па 5 ровараў, а ў ягонай — толькі па два, што ў вашай краіне на кожнага грамадзяніна прыпадае па паўтара трактара, а ў яго і таго менш. Таварыш Пхын Дхын Чхын і папрасіў вас неяк зліквідаваць гэты дысбаланс. Вось ты, дзіця, так, падыдзі да мяне.

Да Леніна падышло абранае ім дзіця.

— Ты хто — хлопчык ці дзяўчынка? — пажартаваў Ленін.

— Я — дзіця, — ацаніла жарт дзіця.

— Які добры адказ, — Леніну падабаліся добрыя адказы. — Ты, напэўна, разведчыкам хочаш стаць? Або дыпламатам?

— Я хачу стаць інфарматарам, — адказала дзіця.

— ...Добрая прафесія, — памарудзіўшы, ухваліў выбар дзіцяці Ленін. — А я ў твае гады марыў стаць кіраўніком якой-небудзь невялікай сельскай гаспадаркі. І, як бачыш, мара мая збылася. Мар, галоўнае, каб гэта нікому не шкодзіла. Як цябе зваць, дзіця?

— Паўлік, — зноў адказала дзіця.

— Паўлік, — усміхнуўся Ленін. — Я нават паспрабую здагадацца, як тваё прозвішча — Марозаў?

— Праўда? — не ўсміхнулася дзіця.

— ...Цікава, — прамармытаў Ленін, але працягнуў: — Паўлік, скажы мне — табе да твайго трактара патрэбная яшчэ палова? Думаю, што не. А краіне таварыша Пхын Дхын Чхына яна вельмі патрэбная. З гэтых паловаў яны збяруць адзін вялікі трактар і тады ого-го як. Ты гатовы аддаць сваю палову?

— Заўсёды гатовы, — зноў адказала дзіця.

— Малайчына, — падзякаваў яму Ленін. — Ленінец? Я так і ведаў. Ну, ідзі на сваё месца.

— Таварыш Ленін, — нечакана звярнулася да яго дзіця. — А можна я пра трактары раскажу сваёй маме?

— Вядома, вядома, — дазволіў яму Ленін. — І маме раскажы, і тату.

— А таты ў нас ужо няма, — проста адказала яму дзіця і пакрочыла на сваё месца, а Ленін уважліва праводзіў яго выпрастаную спіну позіркам.

— Дзеці, — стаў падводзіць вынік трохдзённых зносін з дзецьмі Ленін. — Як я разумею, вы таксама гатовыя падзяліцца роварамі, а асабліва — трактарамі, якіх так не хапае краіне таварыша Пхын Дхын Чхына? Дзякуй. Я літаральна бачу ўсмешлівыя твары дзяцей яго краіны. І калі б на маім месцы быў паэт, ён сказаў бы так з гэтай нагоды: калі ўсміхаецца дзіця — усміхаецца цэлы свет. А на атрыманыя з продажу ровараў і трактароў грошы я вам куплю шмат шакаладу і жуйкі. Хочаце жуйкі?

— Хочам! — запляскалі дзеці.

— Вось і добра, — Ленін выцер слязінку. — Я куплю вам вельмі шмат жуйкі. А цяпер ідзіце дадому.

І дзеці пайшлі дадому, а прэзідэнт накапаў сабе 30 кропляў валакардыну, выпіў і заеў шакаладам: ён заўсёды хваляваўся да, падчас і пасля размовы з дзецьмі.

— Паўлік Марозаў, таты ўжо няма, — ні да кога канкрэтна не звяртаючыся, прагаварыў Ленін. — Сука якая.

На ўсялякі выпадак Ленін паклаў у рот яшчэ пласцінку валідолавай жуйкі, потым лёг на канапу, закруціўся ў калматы плед і пачаў глядзець серыял «Ліквідацыя-5».

# Чаму расійскія турысты едуць у Беларусь?

**За мінулы год Беларусь наведала больш за 95 тысяч турыстаў, з іх 57 тысяч прыехалі з Расіі. Што шукаюць у Беларусі расійскія турысты?**



### Адпачынак

Папулярнасць беларускіх санаторыяў сярод расейцаў вялікая — ужо ў сярэдзіне красавіка амаль усе месцы прададзеныя да кастрычніка. Галоўная прычына — беларускія пуцёўкі значна таннейшыя за расійскія. Для параўнання: самы дарагі санаторый у Беларусі («Лясное» ў Віцебскай вобласці) каштуе 145 000 рублёў за дзень на чалавека. У Падмаскоўі самы дарагі санаторый «Барвіха» каштуе 873 700 рублёў (цэны ў нашых рублях). Самы ж танны падмаскоўны санаторый, «Лесная опушка», абыходзіцца ў 120 000 рублёў за суткі, у той час як найтаннейшы санаторый у Беларусі — гэта «Буг» у Брэсцкай вобласці, 82 000 рублёў.

Для параўнання возьмем умовы жыцця у самым дарагім беларускім санаторыі і самым дарагім санаторыі ў расійскай сярэдняй паласе.

Відавочна, што ехаць у Беларусь расійскім турыстам проста выгадна.

### Экскурсія і транзіт

Яшчэ адна прычына, чаму штогод у Беларусі з'яўляюцца турысты з суседняй дзяржавы — экскурсійныя паездкі (часцей за ўсё ў Мінск і ў Гродна) і проста транзіт праз Беларусь — гэта датычыць тых, хто едзе ў Еўропу на машыне. Экскурсійныя праграмы ў Расіі нятанныя, таму расейцы аддаюць перавагу «дзікаму» турызму. Цікава чытаць іх водгукі пра нашу краіну.

### «Як правільна: Беларусь ці Беларуссія?»

Палова расейскіх турыстаў абмяркоўваюць гэтае пытанне. У якасці асноўнага аргумента звычайна выкарыстоўваецца фраза «Не вучыце мяне размаўляць па-расейску!». У якасці контраргумента да назвы «Беларусь» падаюцца ўсе іншыя значэнні слова, спіс якіх пачынаецца з трактара. Сярод водгукаў турыстаў можна сустрэць абодва варыянты назвы, але Беларуссія пераважае, асабліва ў спалучэнні са словам «загадкавая».

### «Зайчыкаў няма!»

«Першы шок у Беларусі ў нас здарыўся, як толькі мы пераехалі мяжу і зайшлі ў кавярню, — піша турыстка з Масквы. — Мы ўбачылі беларускія грошы, зайчыкаў на іх не было!» Затое колькасць нулёў на купюры прымушае іх фатаграфаваць цэннікі, каб пасля «палохаць» сяброў у Маскве: глядзіце, малако за 1500 рублёў! Асаблівым попытам карыстаецца пяцітысячная банкнота, бо яна — з лыжнікам, а лыжнік у Беларусі — гэта, на думку расейцаў, «вядома хто». Тое самае тычыцца і сторублёвай банкноты — «сто зялёных» ці «сто беларускіх баксаў».

Што яшчэ мацней здзіўляе аматараў сувеніраў — гэта адсутнасць піўных келіхаў з выявай Лукашэнкі. У Маскве ў турыстычных мясцінах можна набыць келіх з выявай любога генсека альбо прэзідэнта — ад Леніна да Мядзведзева. Аднойчы мне давялося абысці ўвесь цэнтр Мінска разам з расейскім турыстам, які шукаў менавіта такі сувенір. Урэшце ён згадзіўся набыць келіх з выявай зубра: «А з Лукашэнкам я на Арбаце куплю».

### Мінулае

«Камуністычная будучыня з фантастычных раманаў», — так любяць апісваць Беларусь. Атмасфера кожнай другой справаздачы — «мы вярнуліся ў мінулае» ці «ў шчаслівае дзяцінства». Падабенства Беларусі і, у прыватнасці, Мінска да былога СССР ужо стала штампам. «Няма рэкламы, няма злачынстваў, няма вады/ацяплення ў нумары», — менавіта гэтыя фразы ідуць у водгуках адразу пасля ўзгадвання пра мінулае. Цікава, але шмат расейцаў заўважаюць, што ў Мінску «вельмі мала міліцыі». А яшчэ вельмі любяць напісаць пра «раваровых міліцыянтаў» і трактар даішнікаў. «Міліцыянты ў Мінску вельмі прыстойныя, прынамсі, худзейшыя за расійскіх», — здзіўляюцца турысты з Усходу.

Асноўнай адмоўнай рысай Беларусі турысты лічаць хамства сферы абслугоўвання, якое ёсць і ў Расіі, але не ў такой колькасці. З іншага боку, некаторым хамства таксама даспадобы — тым, хто едзе «панастальгаваць».

З плюсаў вылучаюць: сталінскую архітэктуру Мінска і асобныя помнікі Горадні. Гэтак жа пішуць пра сумленнасць беларускіх даішнікаў і чысціню Мінска.

З асноўных якасцяў беларусаў найчасцей вылучаюць прастату і гасціннасць.

Пра беларускую мову пішуць станоўча — хто чуў, тым спадабалася.

А ўвогуле ў справаздачах з паездак па Беларусі найчасцей сустракаюцца словы: «мінулае», «спакойная» і «чысты».

**Юрась Ускоў**

---

ЖАХІ

### Атэла міжволі

30-гадовы румын забіў сваю жонку. Ён даказвае, што яму прыснілася, нібы яна яму здрадзіла. Прычым прысніў ён тое ў такіх дэталях, што, калі прахапіўся і пабачыў здрадніцу побач, задушыў яе. Апамятаўшыся, ён дарэмна спрабаваў жонку ажывіць.

Ці тое праўда, а ці не — можа, забойца проста імкнецца ўдаць стан афекту, які зменшае пакаранне.

**Сяргей Гезгала**

---

АПОШНІ ПІСК

### Пракат сяброў

У некаторых краінах Еўропы практыкуецца новы від паслуг — пракат сяброў. Сярэдні кошт арэнды сябра складае $60 за гадзіну.

Як паведамляюць сацыёлагі, гэта форма сяброўства ў вышэйшай меры запатрабаваная сучасным індустрыяльным грамадствам: «Людзі імкнуцца знайсці чалавека, гатовага без спешкі правесці з імі вольны час у шчырай размове».

Заказаць сябра можна праз інтэрнэт на спецыяльных сайтах. Усе яны платныя, і для членства кандыдату даводзіцца прайсці даволі жорсткі адбор. Адна з галоўных умоў пракату — наяўнасць у арандатара выключна сяброўскіх пачуццяў і намераў.

Працаваць у бюро па пракату ідуць у асноўным маладыя людзі, якія хочуць паспрабаваць сябе ў цікавай справе і падзарабіць.

**Паводле БЕЛТА**

---

АБЫ НОВАЕ

## Захапленне фільмамі 3D скончылася?

Шмат што сведчыць пра тое, што поспех «Аватара» быў хутчэй выняткам, чым правілам.

Галівуд пачаў паспешліва выпускаць як мага больш фільмаў у тэхналогіі 3D. Але з кожным наступным прыбыткі скарачаюцца. Гледачы выбіраюць таннейшыя квіткі традыцыйных кінатэатраў.

Прычына яшчэ і ў тым, што з усіх фільмаў, выпушчаных апошнім часам у тэхналогіі 3D, толькі некаторыя цалкам гатовыя і з самага пачатку прызначаныя для трохмернай праекцыі. У астатніх 3D-эфекты былі дададзеныя пазней.



У выніку фільмы з «дададзеным» 3D папросту занадта цёмныя. Іх якасць пагаршаецца так рэзка, што з «Бітвы тытанаў» многія нават сыходзілі з кінатэатраў. Прагляд фільмаў у 3D на практыцы азначае, што вачэй дасягае толькі «палова» святла, што адбіваецца ад экрана, астатняе фільтруецца праз акуляры. Можна кампенсаваць гэты эфект, робячы відэа адразу з улікам 3D-праекцыі, як «Аватар», ці як IMAX, выкарыстоўваючы два пражэктары. Гэта, аднак, прыводзіць да значных складанасцяў падчас паказу, што патрабуе дадатковага абсталявання і, адпаведна, значнага павелічэння выдаткаў.

Выглядае, што ёсць тры варыянты развіцця сітуацыі. Па-першае, кінатэатры могуць атрымаць новыя апаратныя сродкі, якія забяспечваюць дастатковую яркасць для праекцыі 3D, хутчэй за ўсё, лазерныя праектары, над якімі працуюць ужо некалькі кампаній. Тут, аднак, ёсць праблема коштаў, асабліва калі ўлічыць, што многія кінатэатры нядаўна перайшлі на «лічбу». Па-другое, Галівуд можа палічыць, што аўчынка не варта вырабу, і пачне абыходзіцца без 3D-фільмаў, вярнуўшыся да сваёй ранейшай нішы. Нарэшце, апошні варыянт, які падаецца найбольш прывабным: студыі пачнуць здымаць фільмы, у якіх 3D будзе планавацца з самага пачатку, а не дадавацца пасля.

**technologie.gazeta.pl**

---

КАХАННЕ І СЭКС



## Малы беларуска-беларускі слоўнік любоўных паняццяў

- **Абдоймы** — абдымкі.
- **Атуляць** — абдымаць, ахінаць (цяплом, пяшчотай).
- **Буська, буся** — лёгкі пацалунак. Слова абсалютна беларускае і ў нашых суседзяў амаль не сустракаецца. «Дай бусю!» — пацалуй! Просяць як малых, так і вялікіх.
- **Датклівы** — чуллівы, далікатны.
- **Жарсць** — страсць, палкасць, захапленне.
- **Жарсны** — палкі, гарачы ў каханні.
- **Заляцацца да жанчыны (мужчыны)** — рас. ухаживать за женщиной (мужчиной), анг. to pay court to a woman (man).
- **Залёты** — рас. ухаживания, анг. courting.
- **Залётнік** — кавалер, рас. ухажёр, анг. ladies' man.
- **Замілаванне** — любоў, шчасце.
- **Каханак≠палюбоўнік.** Вы закаханыя адно ў аднаго? Значыцца, вы каханкі, і няважна, жанатыя вы ці не, і ці жанатыя ўвогуле. А вось палюбоўніца (палюбоўнік) можа з'явіцца толькі ў жанатага мужчыны (замужняй жанчыны).
- **Лашчыць** — гладзіць, пяшчотна датыкацца.
- **Любасць** — любоў.
- **Любоў≠каханне.** У сучаснай беларускай мове значэнні гэтых словаў не заўсёды супадаюць. Любоў можа быць да маці, а каханне — да дзяўчыны. Разам з тым, чуллівае і жарснае каханне да дзяўчыны можа перарасці ў глыбокую і ўсёабдымную любоў да яе. А вось рух у супрацьлеглы бок, ад любові да кахання, не заўсёды магчымы. Недарэчна будуць гучаць выразы «каханне да маці», а таксама «каханне да Радзімы» або «каханне да кнігі».
- **Пабрацца шлюбам** — ажаніцца.
- **Узяць шлюб** — ажаніцца.
- **Улялюскацца па самыя вушы** — моцна закахацца, утрэскацца. Гэты выраз ужываецца з адценнем жартаўлівасці.

Не абмінем мы сваёй увагай і любоўныя эпітэты. Пададзеныя ніжэй ланцужкі дапамогуць апісаць сваё захапленне жанчынай ці мужчынам, бо прыметнікі могуць, зразумелая рэч, з лёгкасцю памяняць свой род.

**Прыгожая, гожая, харошая, пекная, грэчная, красная, файная.**

**Чароўная, цудоўная, вабная, прывабная, прываблівая, панадная, дзівосная, дзіўная.**

**Вытанчаная, вышуканая, далікатная, зграбная.**

**Асляпляльная, шыкоўная, раскошная, невыказная, невымоўная, ашаламляльная.**

**Сямён Цыбульскі**

# Стынг: «Я хачу, каб пара з вушэй пайшла»

**Англійскі музыка заспявае ў «Мінск-Арэне» 18 верасня. Ён прэзентуе новы альбом Symphonicity і выканае іншыя свае хіты за 30 гадоў. Разынка вечара — акампанаваць Стынгу будзе Лонданскі каралеўскі філармантчны аркестр.**

Музычныя крытыкі ўжо заўважылі, што назвай новы альбом нагадвае Synchronicity — апошнюю працу гурта The Police, у складзе якога Стынг зрабіўся славутым. Ці не значыць гэта, што гэтым турам Стынг надумаўся завяршыць музычную кар'еру? 58-гадовы музыка ўсё абверг і адказаў, што назва — «каламбур, не больш за тое».

Альбом розніцца ад усіх папярэдніх тым, што ўсе 12 яго песняў запісаныя з сімфанічным аркестрам. Такая ідэя нарадзілася выпадкова, калі чыкагскі аркестр папрасіў Стынга даць супольны канцэрт. Выступ так спадабаўся Стынгу, што ён наняў аранжавальнікаў, каб прыстасаваць свае песні да гучання сімфанічнага аркестра, даўшы поўны карт-бланш. Паставіў толькі адну ўмову: «Каб музыкам, якія атрымалі класічную адукацыю, усё гэта было цікава. Каб яны не сядзелі, выпільваючы са сваіх скрыпак акампанемент да рок-балады. Я хачу, каб пара з вушэй пайшла, каб увесь аркестр выкарыстоўваўся як рытмічны інструмент».

Шоу ў **Мінск-Арэне 18 верасня** будзе складацца з двух аддзяленняў і працягнецца каля трох гадзін. **Пачатак а 20-й.** Квіткі: ад 120 тыс. да 1,5 млн рублёў.



## ФУТБОЛ

### «Дынама» (Мінск) — «Макабі» (Хайфа)

**5 жніўня** пройдзе матч у адказ трэцяга кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы. Мінскае **«Дынама»** на аднайменным стадыёне прыме ізральскі «Макабі». **Пачатак у 19:00.** Першая гульня прынесла поспех «Макабі» — 1:0. Тым не менш, шанцы застаюцца на працяг барацьбы. Таксама ў гэты дзень у чэшскай Астраве магілёўскі «Дняпро» падужаецца з мясцовым «Банікам». Першы матч выйгралі беларусы — 1:0. **Пачатак у 19:00** (па мінскім часе).

## ВЫСТАВЫ

### Шлях на Грунвальд

**13 жніўня а 17-й у галерэі «Універсітэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1)** — адкрыццё калектыўнай фотавыставы «Шлях на Грунвальд», прысвечанай 600-годдзю вялікай бітвы. У экспазіцыі больш за 60 работ вядомых беларускіх майстроў фатаграфіі.

### Сакалінае паляванне — царскае, псовае — барскае

**У Гомельскім палацава-паркавым ансамблі (пл. Леніна, 4) да 29 жніўня** працуе выстава «Сакалінае паляванне — царскае, псовае — барскае», на якой прадстаўленыя экспанаты з фондаў Дзяржаўнага Дарвінаўскага музея (Масква), а таксама разнастайныя прадметы палявання з фондаў музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля і прыватных калекцый.

### Жывапіс Юдаля Пэна

**Тамсама да 26 жніўня** працуе выстава жывапісу Юдаля Пэна. На выставе экспануюцца 33 творы мастака са збораў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

### Народжаныя морам

**У гомельскай мастацкай галерэі Г.Вашчанкі (вул. Карповіча, 4) да 20 жніўня** працуе выстава «Народжаныя морам», дзе можна ўбачыць ракавіны разнастайных памераў і колераў, каралы… Усяго больш за 900 экспанатаў.

### Брама мінулага

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасці, 47) да 15 жніўня** працуе выстава графікі Паўла Татарнікава «Брама мінулага». Выстава праходзіць у рамках грамадскага абмеркавання вылучэння серыі графічных твораў «Брама мінулага» ад грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз мастакоў» і ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў» на Дзяржаўную прэмію Беларусі ў галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры.

### Памяць пра Грунвальдскую перамогу

**Да 29 жніўня ў Гістарычным музеі** працуе выстава «Памяць пра Грунвальдскую перамогу», прысвечаная 600-м угодкам Грунвальдскай бітвы.

### Саюз расейскіх мастакоў

**У Мастацкім музеі да 28 жніўня** працуе выстава «Саюз расейскіх мастакоў. Новы час». На выставе прадстаўленыя 74 творы жывапісу і графікі 35 аўтараў з 14 гарадоў Расіі.

### Паэзія ў будзённасці

**У Мастацкім музеі да 30 жніўня** працуе рэтраспектыўная выстава жывапісу Барыса Казакова «Паэзія ў будзённасці».

### Людзі Прагі.

**У галерэі «Экспансія» (вул. Янкі Купалы, 17) да 15 жніўня** працуе фотавыстава Віталя і Сяргея Раковічаў «Людзі Прагі».

### Belart.by

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасці, 47) да 8 жніўня** працуе графічная выстава «Belart.by. Маладыя мастакі Беларусі».

### Гіганты ледавіковага перыяду

**У Гістарычным музеі да 29 жніўня** працуе выстава «Гіганты Ледавіковага перыяду» з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі Санкт-Пецярбурга «Петрапаўлаўская крэпасць». Мадэлі жывёл для выставы адноўлены па шкілетах даўніх вымерлых істот. Для гэтага выкарыстоўваліся сучасныя камп'ютарныя праграмы з трохмернай графікай. Экспанаты рухаюцца і рыкаюць!

### Беларускія ўзоры

**У Музеі беларускага народнага мастацтва (Раўбічы) да 31 жніўня** працуе выстава «Беларускія ўзоры»: пляценне з прыродных матэрыялаў, кераміка, аплікацыя саломкай, ручная коўка, разьба па дрэве.

### Свет з вышыні

**У Доме-музеі Ваньковічаў (вул. Інтэрнацыянальная, 33а) да 20 верасня** працуе выстава маляваных мапаў Рубена Атаяна «Свет з вышыні».

## ІМПРЭЗЫ

### Залессе запрашае сяброў

**7 жніўня ў маёнтку Міхала Клеафаса Агінскага, у вёсцы Залессе Смаргонскага раёна**, адбудзецца фестываль-кірмаш «Залессе запрашае сяброў». У праграме фестывалю: выстава-продаж вырабаў народных майстроў, экскурсія па маёнтку Агінскіх, канцэрт мастацкай самадзейнасці былых і цяперашніх жыхароў Залесся ды навакольных вёсак, а таксама гасцей з-за мяжы (Польшча, Літва, Латвія), танцавальны майстар-клас (вас навучаць першым крокам паланэза — вядомага ў даўніну танца!). **Пачатак аб 11-й гадзіне.** Дадатковая інфармацыя і даведкі праз тэл. (029) 313-55-57.

### Дах-XI

**Да 15 жніўня ў Палацы мастацтва** працягваецца фестываль эксперыментальнага мастацтва «Дах-XI» пад назвай «Mageia Cerebrum» («Цёмныя таямніцы Мозга»).

### Навальніца

**27—28 жніўня ў ГСАК «Лагойск»** — міжнародны фестываль феерверкаў з удзелам лепшых піратэхнічных каманд Еўропы і Расіі. Прафесійныя піратэхнікі будуць змагацца за галоўны прыз фестывалю, прадэманструюць апошнія навінкі піратэхнічнага мастацтва… Больш падрабязна пра фестываль можна даведацца на http://navalnica.by/.

## КІНО

# Анджаліна з гранатамі

**Солт** (Salt)
ЗША, 2010, каляровы, 100 хв.
**Рэжысёр:** Філіп Нойс
**Ролі выконваюць:** Анджаліна Джолі, Ліў Шрайбер, Чыўэтэл Эджыяфор, Даніэль Альбрыхскі, Аўгуст Дзіль
**Жанр:** Шпегаўскі трылер, баявік
**Адзнака:** 6 (з 10)




Эвелін Солт — супрацоўніца ЦРУ, якой давяраюць. Але схоплены расейскі агент заяўляе, што Солт — законспіраваны крот. І задача Солт — забіць расейскага прэзідэнта, які гасцюе ў Амерыцы. Адлік пайшоў.

Карціна Філіпа Нойса з Анджалінай Джолі ў ролі агенткі з'явілася акурат падчас шпегаўскага скандалу, калі ў ЗША была выкрытая расейская сетка кратоў. Фігурантку скандалу Ганну Чэпмэн нават запрашалі на прэм'еру фільма ў Маскву скласці кампанію Анджаліне. Чэпмэн не прыехала.

Затое ў нас ёсць магчымасць ацаніць кіназжарсці, знятыя ў смачных традыцыях халоднай вайны. Акрабатычныя бойкі, скачкі на машынах, крыкі «мяне падставілі». Прыгажуня-актрыса, якая ветліва раскідвае гранаты, футравая шапка на Анджаліне — новыя незабыўныя кадры.

І ўсё гэта — у дзікім тэмпе высокабюджэтнага трылера, дзе абавязкова ўратоўваюць цэлы свет.

Дарэчы, колішняя жонка Філіпа Нойса — таксама Чэпмэн.

**Андрэй Расінскі**






# Адпачынак у Грузіі: дзе яго шукаць?

Беларускае тэлебачанне масіравана рэкламуе адпачынак у Грузіі, у той час як знайсці прапановы ад турфірмаў немагчыма. Рэклама ўражвае: сумесь сучаснасці і гісторыі, еўрапейскі ўзровень...

«І вы таксама наконт Грузіі? Вось што значыць паказаць народу прыгожыя карцінкі! — супрацоўнік турфірмы «Вяршыня» відавочна стаміўся тлумачыць. — Ніхто ў Мінску не робіць групавых тураў у Грузію. А рэкламу замовіла амбасада».

Аднак, калі вельмі хочацца, фірма прапануе персанальныя туры. Пералёт у абодва бакі — 350 даляраў, дзень пражывання на дваіх — 100. Тры дні ў Тбілісі будуць каштаваць як уік-энд у Стамбуле.

Турфірмы адчулі на сабе моц рэкламы — у верасні плануецца запусціць экскурсійны тур у Тбілісі, а пасля адпачынак на гарналыжных курортах, якімі Грузія славілася заўжды. Цяпер, па словах спецыялістаў, не найлепшы сезон для экскурсій — у Тбілісі стаіць гарачыня, і ад гэтага цярпіць вельмі багатая экскурсійная праграма.

### Дзе жыць?

Даляцець да Тбілісі каштуе ад 195 еўра (для параўнання: столькі ж каштуе авіябілет да Стамбула, а білет у Сочы абыдзецца беларусу ў 140 еўра). Рэйс ад «Белавія» Мінск — Тбілісі штодзённы.

Выбар гатэляў у Грузіі таксама багаты — ад трохзоркавых за 100 даляраў, да пяцізоркавых за 200. Гэта, што тычыцца Тбілісі. Кошты ў курортных гатэлях вышэйшыя — нумар на два месцы ў двухзоркавым гатэлі ў Батумі абыдзецца ў $170.

А нумар на два месцы ў гатэлі горнага курорта Гудауры будзе каштаваць 100 даляраў у дзень. На другім найвядомейшым горным курорце Грузіі, Бакурыяні, выбар гатэляў па коштах павінен задаволіць любога турыста: ад $80 за нумар у самым цэнтры курорта.

Пры неабходнасці адміністрацыя гатэля арганізуе трансфер з аэрапорта Тбілісі, таму праблемы дабрацца да курорта няма. Тым больш што браніраваць гатэль лепш загадзя — попыт на іх вялікі, і адразу выраша́ць пытанне трансферу.

Большасць гатэляў маюць інтэрнэт-сайты з поўнай інфармацыяй. Параўнаць кошты, забраніраваць нумары можна на «агульных» сайтах, кшталту: http://www.advantour.com/rus/georgia/hotels.

### Што глядзець?

Бадай, самае складанае пытанне. У Грузіі столькі славутых мясцін, на якія варта зірнуць, што выбраць найвыбітнейшыя амаль немагчыма. У першую чаргу варта паглядзець старую частку Тбілісі і старажытную сталіцу Мцхету. А больш за ўсё вам пашанцуе, калі ёсць грузінскія знаёмыя, кажа выдавец Уладзімір Сіўчыкаў, які вучыўся ў Грузіі. Яны абавязкова звозяць вас у свае родныя мясціны і там пакажуць і раскажуць усё. Сп. Уладзімір дагэтуль узгадвае, як хадзіў на грузінскія дні нараджэння.

Варта зазірнуць у Аджарыю — самы самабытны раён Грузіі, а таксама наведаць Кутаісі. Трэба зазначыць, што па колькасці гістарычных помнікаў і славутых месцаў Грузія адносіцца да найбольш багатых краін свету.

**Юрась Ускоў**



Старажытны замак у Анануры.



Знакамітыя тбіліскія лазні.



Горны курорт Бакурыяні.

## Сапраўдная беларуская кухня

### Страва са смажаных цялячых галоў

2 цялячыя галавы, 2,5 лыжкі масла, 1—2 морквы, 1 пятрушка, 1 сельдэрэй, 1 парэй, 2 цыбулі, 8—12 зярнятаў англійскага перцу, 3—4 лаўровыя лісты, соль, 3 яйкі, шчэпці англійскага і простага перцаў, 3—4 лыжкі цёртых сухароў, 3—4 кавалкі цукру, 50 г сухога булёну, 1 лімон, 0,5 лыжкі мукі. Да мозга: 2 жаўткі, 1 яйка, 1—2 лыжкі булкі, соль, перац, 0,5 лыжкі масла.

Ачышчаныя цялячыя галовы рассячы напалам, выняць мазгі, вымачыць. Галовы зварыць у падсоленай вадзе з перцам, лаўровым лісцем і карэннем, а юшку ад іх працадзіць. Падсмажыць трохі здрабнёнай і апаранай цыбулі ў адной лыжцы масла, калі астыне — змяшаць з узбітымі яйкамі, запра́віць англійскім і звычайным перцам. Разрэзаць галовы на зрэзікі, мачаць зрэзы ў гэтай масе, абсыпаць сухарыкамі, пакласці на змазаную маслам патэльню або бляху і зарумяніць у печы.

Пры падачы заліць такім соусам: падсмажыць трохі мукі ў лыжцы масла, дадаць крыху цукру, даліць 1,5 шклянкі юшкі ад галоваў, кавалачак сухога булёну, праварыць добра на малым агні, пры канцы пакласці ў соус нарэзаны кубікамі лімон (выняць костачкі), яшчэ раз давесці да кіпення і заліць гэтым галовы.

Да прапанаванай стравы можна ўжыць і ножкі, вынеўшы з іх косткі пасля адварвання.

Вынятыя мазгі асвятліць, нарэзаць, змяшаць з жаўткамі і яйкам, пасаліць, папярчыць, змяшаць з цёртай булачкай, запоўніць гэтым фаршам чэрапкі, дзе знаходзіліся мазгі і адкуль іх дасталі перад адварваннем галоў, пакрапіць маслам, запячы і палажыць на страву пры падачы.

**З кнігі Вінцэнты Завадскай «Літоўская кухарка», 1854**

**Падрыхтавала НБ**


## Прыватныя абвесткі

**НЯНЯ**

**Шукаю беларускамоўную** няню для хлопчыка 1 году на 5 гадзін на дзень. Уручча. Т.: (029) 662–69–09. Юлія.

**ПРАДАМ**

**Прадам дачу.** 15 км ад МКАД. Лагойскі напрамак. Т.: (029) 569–79–90.

**ПРАЦА**

**Патрабуюцца паслугі веб-дызайнера/майстра.** Праца з Joomla, phpBB. Пішыце на webmasterjob@tut.by

**ПАДАРОЖЖА**

**Запрашаем** у сяброўскае падарожжа 15 жніўня па маршруце: Мінск—Рагачоў—Доўск—Прапойск—Лясная—Быхаў—Грудзінаўка—Вейна—Мінск. Т.: (029) 111–73–32, (017) 262–73–43.

**КАЦЯНЯТЫ**

**Котка Кася будзе рада** знайсці гаспадароў у асобе добрых і клапатлівых людзей. Спакойная, самастойная ды цікаўная, падыдзе і для прыватнага сектара, і для кватэры. Прывучаная да латка. Т.: (029) 390–63–11.

**Аддам кацянят** у добрыя рукі. Ласкавыя. Ядуць усё. Прывучаныя да латка. Т.: 278–19–78 (з 19–й да 21–й).

**ВІТАННІ**

**Спадара Івана Навумовіча** віншую з 36–годдзем. Жадаю моцнага здароўя, шчасця, кахання, здзяйснення ўсіх мараў і задумаў. З павагай, Аляксей Шалахоўскі.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e–mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!


БЗІК

## Лётаць не страшна

### Ніколі не лёталі? Дык давайце з Мінска ў Гомель за 45 тысяч.

З Мінска да Гомеля можна дабрацца менш за гадзіну... лёту. Гэта адзіны абласны цэнтр, які мае простае авіязлучэнне са сталіцай.

Перад вылетам я трохі сумняваўся. Скепсіс быў выкліканы ўзростам самалёта ўАН-24: апошні экзэмпляр гэтай мадэлі выпусцілі трыццаць адзін год назад. Але, калі падняліся ў паветра, зразумеў, што ўзрост неспрактыкаванаму воку пасажыра заўважаецца толькі па нейкіх знешніх дэталях.

Хто ж лётае на гомельскіх самалётах? Усіх пасажыраў было каля трыццаці. Дзевятнаццаць ляцелі з Калінінграда (яшчэ дзясятак выйшаў у Мінску). Мужчына ў дзелавым касцюме. Бацька з дзяўчынкай. Яшчэ адна дзяўчына без суправаджэння. Шмат пенсіянераў.

Палёт да Гомеля займае 55 хвілін. Калі дадаць яшчэ час рэгістрацыі на рэйс, а таксама выгрузку багажу, то агулам гэта крыху больш за паўтары гадзіны.

Вылет з Мінска ў 20.15. У Гомелі ўжо ў 21.10. Зручна, бо хутка. І не трэба марнаваць на дарогу працоўны дзень. Але авіярэйсы арганізаваныя толькі двойчы на тыдзень: у сераду і нядзелю. Гэта гаворыць аб іх непапулярнасці, хай нават і праз адсутнасць належнай рэкламы.

Гомельскі аэрапорт — гэта тэрыторыя амаль у тры сотні гектараў. Узлётна-пасадачныя палосы, аэравакзал, склады. Ёсць нават гатэль. Прынамсі, тое, што ад яго засталося. Пад нумары цяпер выкарыстоўваецца толькі другі паверх. Аўтобусы ў горад ходзяць пасля кожнага рэйса.

**Кастусь Матушыч**

**АН-24**

пасажырскі самалёт. Дальнасць палёту — 3000 км, крэйсерская хуткасць — 490 км/г. Гады вытворчасці: 1962–1979. Было выпушчана звыш 1000 самалётаў. Больш за 300 яшчэ эксплуатуюцца, збольшага ў краінах СНД і Афрыкі. Змяшчае 48 пасажыраў.

**Што па чым**

Мінск — Калінінград — 75 еўра.
Гомель — Калінінград — 87 еўра
Гомель — Мінск — 45410 бел. руб.
Гродна — Калінінград — 62 еўра
Брэст — Калінінград — 75 еўра.

ЗДАРОЎЕ

## Гучная музыка правакуе галаўныя болі

Чаму ў сучасных падлеткаў так часта баліць галава? Такое пытанне перад сабой ставілі даследчыкі з Універсітэта Мюнхена.

Даследаванні з удзелам больш як тысячы добраахвотнікаў апраўдалі і тэлевізар, і камп'ютар, і мабільнік. Вінаватымі аказаліся магнітафоны і плэеры!

Найбольшую небяспеку ўяўляюць слухаўкі: ад іх не толькі баліць галава, але і слых псуецца.

**Сяргей Гезгала**

ТЭХНАЛОГІІ

## Шэсць праграмістаў атрымалі ключы ад сусветнага ітэрнэту

Група з шасці чалавек будзе валодаць паўнамоцтвамі і спецыяльнымі кодамі для перазагрузкі інтэрнэту ў выпадку яго глабальнага збою. Яна створана рашэннем спецыяльнай міжнароднай камісіі.

Паведамляецца, што кожны член гэтай групы мае фрагмент ключа, які здольны перазагрузіць інтэрнэт. Ключ выкананы ў форме мікрасхемы, схаванай у пластыкавую карту.

Падобныя меры засцярогі сталі магчымыя пасля запуску новай сістэмы бяспекі Domain Name System Security Extensions (сістэмы бяспечнага пашырэння даменнага імя).

У выпадку надзвычайных абставінаў, напрыклад, тэхналагічнай катастрофы або найбуйнейшай тэрарыстычнай атакі на тэлекамунікацыйныя аб'екты спецыяльная група з шасці праграмістаў, сабраўшыся разам, зможа зноў запусціць глабальную сетку.

Радыёстанцыя назвала аднаго з уладальнікаў фрагмента ключа — гэта нейкі Пол Кейн, які пражывае ў англійскай горадзе Бас і выкладае ў мясцовым універсітэце.

**Electroname.com**

## Кемікі



1) Ці можа снег ісці тры дні запар?

2) Што чуем у пачатку любой «раніцы»?

3) Што супольнага ў дня і пня?

4) Што знаходзіцца паміж берагам і ракой?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**

**Адказы глядзі на старонцы 16.**



Прэм'еры Беларусі і Літвы ў ролі Радзівілаў. Сяргей Сідорскі і Андрус Кубілюс падчас нефармальнай сустрэчы ў Нясвіжы праехалі па горадзе ў брычцы.




Падчас знішчэння кантрабандных цыгарэтаў на звалцы ля Мінска трапіла пад раздачу і дзяржсімволіка.



1 жніўня, у дзень свайго нараджэння, Вікторыя Азаранка выйграла турнір Сусветнай тэніснай асацыяцыі ў Стэнфардзе. У фінале яна перамагла расіянку Марыю Шарапаву — 6:4, 6:1.




«Сірыя зацікаўленая ў прысутнасці на рынку Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі», — заявіў прэзідэнт Сірыі Башар Асад падчас візіту ў Мінск.



У Пакістане — найбольшая ў гісторыі паводка. Загінула 1500 чалавек, бедства закранула мільён пакістанцаў.

## КАЛЯНДАР

### Жнівень

**6** — Перамяненне Божае ў каталікоў. Свянцяць яблыкі.

**9** — 100 гадоў ад нараджэння паэткі Ларысы Геніюш.

**11** — Пачатак месяца Рамадан у мусульманаў.

**14** — 625 гадоў Крэўскай уніі.

**15** — Спленне (Унебаўзяцце) ў каталікоў. Свянцяць кветкі.

**15** — 50 гадоў Ігару Варашкевічу, лідэру рок-гурта «Крама».

**19** — Спас у праваслаўных. Свянцяць яблыкі.

**28** — Спленне (Успенне Маці Божай) у праваслаўных. Свянцяць кветкі.

**Склаў ЛК**

## Анекдоты

* * *

У вёсцы няма такога разумення, як «біятуалет». Там ёсць разуменне «біяполе».

* * *

— Не, мужыкі, мне піць нельга. Вера не дазваляе.

— Ты хіба мусульманін?!

— Жонка ў яго — Вера. 85 кг. Шпалаўкладчыца.

* * *

Званок у цырк:

— Вас цікавіць нумар, у якім глядач кладзе сваю галаву проста ў пашчу кракадзілу?

— Арыгінальна. Што патрабуецца з нашага боку?

— Кожны дзень новы глядач.

— А хто гэта тэлефануе?

— Кракадзіл.

* * *

Калі жанчына пачынае фразу са слоў «не хачу цябе пакрыўдзіць», рыхтуйся пачуць самае абразлівае ў сваім жыцці.

* * *

Дачцэ ўжо ўпару жончыны сланцы, а я ўсё ніяк не наважваюся ёй сказаць, што Дзеда Мароза не існуе.

## «НН» сто гадоў з вамі

**Рады для гаспадароў.** Прызначаную ў севу салетру раздзяліце на дзве часці: першую пасейце, як узойдзе расліна, другую пасля 7—10 дзён, а пад бульбу й буракі перад матыкаваннем.

**«НН». №31. 1910**

**Лейтэнант Батурын праславіўся** сваімі прызнаннямі, што ўлада спецыяльна рыхтавала правакатараў у цывільным да леташняга Маршу Свабоды, каб здыскрэдытаваць апазіцыю. Маўляў, ён і сам быў сярод тых, хто меў падбухторваць беспарадкі. Менавіта гэтыя шпегі падпалілі пошту на вуліцы Змітрака Бядулі па шляху шэсця. У меркаванае месца сутыкненняў маршоўцаў з сіламі спецыяльнага прызначэння былі загадзя адмыслова дастаўленыя паддоны з тратуарнай пліткай, а іншыя шляхі для руху калоны былі перакрытыя.

Няясна, чаму ж Батурын пра камяні паведаміў не да, а пасля бойкі? Маглі ж загінуць людзі! Ці мо і яны, супрацоўнікі спецаддзела МУС, усяго плана правакацыі не ведалі?

**«НН». №30. 2000**

**Адказы да старонкі 15.**

1) Не, таму што паміж днямі бываюць ночы. 2) Гук «р». 3) Мяккі знак. 4) Літара «і».

Наша Ніва
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).
сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Мінск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.
E-mail: nn@nn.by
On-line: www.nn.by
© НАША НІВА.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.
Наклад 6360. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 27.07.2010.
Замова № 3757.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614